Bielarus567c.qxd 4/10/2010 11:39 PM Page 3

*Жыве Беларусь!*

# БЕЛАРУС

Address: P. O. Box 3225
Farmingdale, NY 11735

BIELARUS/Belarusan newspaper in Free World ISSN 1054-9455
Published by the Belarusan American Association, Inc.

№ 567 Красавік 2010 г.
Год выданьня 60

# Сьвяточныя мітынгі на Дзень Волі




***Беларуская моладзь каля амбасады Беларусі ў Вашынгтоне.***

## ВАШЫНГТОН

Сябры Згуртаваньня Беларускай Моладзі ў Амэрыцы на Дзень Волі арганізавалі сьвяточную дэманстрацыю ля беларускай амбасады ў Вашынгтоне. Моладзь са штатаў Нью-Ёрк і Нью-Джэрзі выправілася ў падарожжаў у Вашынгтон, каб павіншаваць прадстаўнікоў беларускай амбасады. Другой часткай сьвяткаваньня было інфармаваньне жыхароў ЗША аб Беларусі і сытуацыі з правамі чалавека ў ёй.

Па дарозе зь Нью-Ёрку, адкуль выяжджаў адмыслова наняты для пажарожжа аўтобус, да Вашынгтону ўдзельнікі паездкі прыпыніліся ў двух невялікіх мястэчках, дзе раздавалі ўлёткі амэрыканцам.

А 1.30 папаўдні моладзя людзі сабраліся каля амбасады РБ у Вашынгтоне, і правялі сьвяточны мітынг. Воклічы “Жыве Беларусь!” выклікалі непрыхаваную цікавасьць супрацоўнікаў амбасады, якія фатаграфавалі мітынгоўцаў праз вокны. Падчас мітынгу з прамоваю выступілі сябры ЗБМА Любоў Белянкова, Вераніка Скрыпская і Алеся Анішчык.

**Любоў Белянкова:** “У гэты дзень, мы сабраліся, каб ушанаваць памяць нашых змагарных продкаў, дзякуючы якім Беларусь мае зараз незалежнасьць. Хочам нагадаць беларускім уладам, што моладзь памятае пра 25 Сакавіка і добра разумее значэньне гэтага сьвята. На шыю нашага народу зараз накінутая пятля дыктатуры А. Лукашэнкі, што душыць ініцыятыву і не дае беларусам заняць сваё месца ў сям'і свабодных народаў Эўропы.”

**Вераніка Скрыпская**: “Дзень Волі заўсёды меў асаблівае значэньне для маёй сям'і. А сёньня мы хочам паказаць, што выбар беларускай моладзі па ўсім сьвеце – гэта незалежная і дэмакратычная Беларусь. Незалежна ад таго, дзе мы жывем, мы ніколі не забываем пра тое, адкуль мы, і што адбываецца ў Беларусі. ”

**Алеся Анішчык**: “Вельмі радая, што тут сабралася столькі моладзі. Чацьвер гэта працоўны дзень, але мы ўсе здолелі гэта зрабіць.Адрозьненьне нашай акцыі ад падобных у тым, што праходзіць яна ня ў зручны выходны дзень, калі ў амбасадзе ніхто не працуе, а ў дзень нашага сьвята. Беларусы на Бацькаўшчыне ведайце, што мы заўсёды памяталі і будзем памятаць адкуль мы. Жыве Беларусь!”

Пасьля мітынгу каля амбасады сябры ЗБМА разам зь сябрамі БАЗА ў Вашынгтоне ўсклалі кветкі да помніка ахвярам камунізму.

Завершыліся ўрачыстасьці ў Вашынгтоне лекцыяй доктара Вітаўта Кіпеля ў Амэрыканскім Унівэрсытэце. Лекцыя была прысьвечаная праблеме дэмакратыі ў Беларусі і інфармаваньню амэрыканскага студэнцтва і інтэлектуалаў аб прычынах дыктатуры ў Беларусі.

***М. ЦІМАШЭНКА***

## НЬЮ-ЁРК

Беларусы з розных куткоў ЗША сабраліся 27-га сакавіка ў Нью-Ёрку, каб адсьвяткаваць найвялікшае нацыянальнае сьвята – Дзень Незалежнасьці Беларусі – Дзень Волі. Бадай упершыню прадстаўніцтва было настолькі шырокім. Сярод каля паўсотні беларусаў былі людзі ня толькі зь Нью-Ёрку ды ваколіцаў. Прыехалі на акцыю маладзёны з Філядэльфіі ды далёкага Піцбургу, з паўднёвага Нью-Джэрзі, з Масачусэтсу. А адзін маладзён – Яўген – прыехаў з Флярыды: ад ягонага Маямі да штаб-кватэры ААН, дзе адбыўся мітынг – каля двух тысячаў кілямэтраў.

Адразу за віншаваньнямі сябры Беларускага Моладзёвага Руху Амэрыкі, якія выступалі арганізатарамі сьвяточнага мітынгу, выказалі шчырую падзяку ўсім, хто падтрымаў сьвяточны мітынг . “Спадзяюся, у адзін зь дзён праз некалькі гадоў Дзень Волі будзе для кожнага з нас успрымацца як дзень, калі перасьледуюць нашых сяброў ды блізкіх, а можа і зусім невядомых людзей за выкарыстаньне нацыянальнай сымболікі ды за любоў да роднай краіны. Спадзяюся, што праз некаторы час, у тым ліку і нашымі высілкамі, беларусы будуць адзначаць гэтае сьвята ў сямейным коле, сярод сяброў, не абавязкова выходзячы на вуліцу ды выкрыкваючы лёзунгі, а проста ведаючы ШТО ТАКОЕ Дзень Волі для Беларусі, і ЧЫМ ён ёсьць для кожнага з тых, хто называе сябе беларусам”, — сказаў адзін з арганізатараў Дзяніс Талпека.

На мітынгу была прынятая заява ў падтрымку беларускіх журналістаў, якія працуюць пад жорсткім ціскам уладаў.

Нацыянальныя бел-чырвона-белыя сьцягі прыцягвалі ўвагу мінакоў, якія падыходзілі з пытаньнямі ды з жаданьнем фатаграфаваліся зь беларусамі. Традыцыйна, скончыўся мітынг сьпяваньнем нацыянальнага гімну “Мы выйдзем шчыльнымі радамі”, а таксама гімнаў “Магутны Божа”, “Пагоня”.

Было прыемна бачыць, як моладзь, якая складала пераважную бальшыню ўсіх прысутных на мітынгу, знаходзячы знаёмых па інтарэсах, завязвала новыя кантакты ды сьмеючыся ў добрым настроі разыходзілася ў гэты халаднаваты, але сонечны нью-ёркскі дзень. З надзеяй у лепшую Беларусь.

***Паводле belmov.org***




***Удзельнікі мтітынгу каля будынка ААН у Нью-Ёрку.***

# Сьвяточная імпрэза ў Іст-Брансўіку, Нью-Джэрзі

Унядзелю 21 сакавіка аддзелы Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня ў Нью-Ёрку і Нью-Джэрзі правялі сумеснае сьвяткаваньне 92-х угодкаў незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі. Сьвяткаваньне адбылося ў банкетнай залі гатэлю Гаят-Рыджэнсі ў Нью-Брансўіку, Нью-Джэрзі.

Старшыня аддзелу БАЗА ў Нью-Джэрзі Ю. Азарка пачаў урачыстую акадэмію прывітаньнем ад імя аддзелу-гаспадара сьвяткаваньня. Прагучэў амэрыканскі гімн. Затым быў зачытаны тэкст Трэйцяй Устаўной Граматы Рады БНР ад 25 Сакавіка 1918 году, што дэкляраваў Беларусь “вольнай незалежнай дзяржавай, у яе этнаграфічных межах”. Было зачытанае прывітаньне ўдзельнікам сходу ад Старшыні Рады БНР Івонкі Сурвілла. З прывітаньнем ад аддзелу БАЗА ў Нью-Ёрку выступіў ягоны старшыня Віталь Зайка.

Затым былі зачытаныя прывітаньні ад губэрнатара штату Нью-Джэрзі Крыса Крысты, сэнатара Фрэнка Лаўтэнбэрга, кангрэсмэна Фрэнка Палонэ.

З рэфэратам аб Акце 25 Сакавіка і беларускай грамадзе Амэрыкі выступіў грамадзкі дзеяч і гісторык Вітаўт Кіпель. Ён коратка закрануў перадумовы прыняцьця Акту 25 Сакавіка, адзначыўшы, што ад самага моманту абвешчаньня незалежнасьці Беларусі дзеячы БНР імкнуліся надаць гэтай падзеі міжнародны рэзананс, і падкрэсьліў, што праца стваральнікаў БНР была працай на будучыню. “На працягу XX стагодзьдзя былі праявы

***Заканчэньне на бачыне 2***

Bielarus567c.qxd 4/10/2010 11:39 PM Page 4



# 25 Сакавіка ў беларускіх асяродках

## БЭЛЬГІЯ

Раніцаю 25 сакавіка ў Беларускай грэка-каталіцкай царкве Антвэрпану прайшла сьвяточная літургія з нагоды сьвяткаваньня Дабравешчаньня і Дня Незалежнасьці Беларусі.

Па традыцыі беларусы Бэльгіі і Францыі паехалі да магілы Міколы Равенскага ў Лювэне і ўсклалі кветкі. Сьвята прадоўжылася ў цэнтры Брусэлю. Актывісты Беларуска-Эўрапейскага Задзіночаньня распаўсюдзілі больш за 300 ўлётак з інфармацыяй аб Беларусі. Пасьля акцыі, беларускія палітычныя ўцекачы завіталі да раднага БНР Янкі Жучкі, каб павіншаваць з вялікшым беларускім сьвятам. Падчас сьвяточнай бяседы было зачытанае віншаваньне Старшыні Рады БНР Івонкі Сурвілла.

*Паводле БЭЗ-Інфа*

## Лёндан, Вялікабрытанія

Беларусы Вялікабрытаніі правялі шэраг імпрэзаў, прымеркаваных да гадавіны абвяшчэньня незалежнасьці Беларусі ў 1918 годзе. 26 сакавіка адбыўся сьвяточны сход PUBB – клюбу які аб'ядноўвае беларускіх праўнікаў, фінансістаў і бізнэсоўцаў, што працуюць у Лёндане. 28 сакавіка ў Беларускім рэлігійна-культурным цэнтры адбыўся малебен за беларускі народ, сьвяточны абед і прагляд фільму "Тутэйшыя". Для тых, хто быў у цэнтры ўпершыню, а. А. Надсан правёў экскурсію па Бібліятэцы і музэю імя Ф. Скарыны.

Асноўныя ўрачыстасьці запланаваныя на сярэдзіну красавіка, калі пасьля рамонту адкрыецца Беларускі дом і будзе прэзэнтацыя кнігі пра Згуртаваньня Беларусаў Вялікай Брытаніі.

*Алесь ЧАЙЧЫЦ*

## Таронта, КАНАДА

У нядзелю 28 сакавіка каля 50 чалавек сабраліся ў Беларускім грамадзка-рэлігійным цэнтры Таронта, каб адсьвяткаваць Дзень Волі. Падчас імпрэзы – другі раз за гісторыю беларускай прысутнасьці ў Канадзе – адбыўся "скайп-тэлемост".

Ідэя такога тэлемосту ўзьнікла спантанна. Напачатку гэтага году паэт і бард Сяржук Сокалаў-Воюш, які жыве ў ЗША, быў запрошаны ў Таронта на літаратурную вечарыну. Прыехаць ён ня змог і запрапанаваў ўзамен выступіць перад таронтаўскімі беларусамі па Скайпе. Такім чынам, першы экспэрымэнтальны скайп-мост адбыўся 13 лютага, калі Сяржук зь вялікім посьпехам чытаў свае вершы і сьпяваў песьні таронтаўцам.

На Дзень Волі скайп-мост злучыў Таронта зь беларускімі асяродкамі аж пяці краінаў! Праз Скайп беларусаў Таронта павіншавалі Старшыня Рады БНР Івонка Сурвілла, старшыня ЗБС "Бацькаўшчына" Алена Макоўская, лідэр суполкі беларусаў Ванкувэру Ігар Ламака, студэнт з Чэхіі Юрась Юрчанка. Старшыня ТБК у Літве Хведар Нюнька і лідэр беларусаў Атавы Пётра Мурзёнак перакazалі свае словы вітаньня праз тэлефон (адсутнасьць выявы на экране кампэнсавала выдатная якасьць гуку). С. Сокалаў-Воюш падрыхтаваў для вельмі яркую, ёмістую і запамінальную прамову. Зьяўленьне на экране Зьміцра Сідаровіча, паэта і кампазытара, і шасьці ягоных сяброў выклікала ў залі асаблівае ажыўленьне. Музыкі выканалі хіты "А дзе-ж тыя ваяры" і "Пена цёмнага піва".

Падчас сьвяткаваньня, якое вяла старшыня ЗБК Валянціна Шаўчэнка, таксама выступілі Алесь Кот і вакальная група гурта "Яваровы людзі". Пісьменьніца Вольга Іпатава прэзэнтавала новую кнігу "Знак Вялікага Магістра". Магчыма, за такім фарматам імпрэзаў – будучыня, і ня толькі сьвяткаваньняў дня беларускай незалежнасьці, а наагул кантактаў паміж беларускімі суполкамі розных краінаў.

*Паводле "Нашай Нівы"*

## Вільня, Летува

У Таварыстве Беларускай Культуры ў Літве 27 сакавіка адбылося сьвяткаваньне 92-й гадавіны абвешчаньня незалежнасьці БНР. Знакавым момантам стала тое, што сёлета разьяднаныя беларусы вырашылі разам адзначыць галоўнае нацыянальнае сьвята. Пасьля доўгага знаходжаньня пад рознымі сымболікамі, яны сабраліся пад бел-чырвона-белым сьцягам і гербам Пагоня. Кіраўнік Згуртаваньня беларускіх грамадзкіх суполак Летувы Раман Вайніцкі вырашыў зрабіць крок насустрач і пераадолець непаразуменьні. Як ён сам адзначыў: „Беларусь у нас адна, і няма чаго яе дзяліць".

Урачыстасьць пачался віншаваньнем старшыні ТБК Хведара Нюнькі, які зачытаў прывітаньне Старшыні Рады БНР Івонкі Сурвілла. Затым нагадаў аб тых гістарычных момантах, у якіх нарадзілася нашая нацыянальная дзяржава. Дрогой часткай праграмы стаў паказ фільму Ю. Хашчавацкага і А. Дашкевіча "Дзень Волі". У канцы імпрэзы была прэзэнтацыя кніга Анатоля Астапенкі „І где зроділіся і ускормлены суть по Бозе" (Дослед беларускага нацыяналізму), другой па ліку, якую аўтар прэзэнтаваў ў ТБК Літвы.

Беларусы пакрысе вяртаюцца да сваіх каранёў, гісторыі і ўсведамленьня свае місіі ў сьвеце. А гэта сведчыць, што надыходзіць час увасабленьня ў жыцьцё ідэалаў БНР...

*Алесь АДАМКОВІЧ*

Традыцыя сьвяткаваньня ўгодкаў абвешчаньня Беларусі дэмакратычнай і незалежнай дзяржавай склалася ў Вільні ў яшчэ ў 1919-39 гадох. Але пазьней, калі амаль уся беларуская інтэлігенцыя была вынішчаная ці сасланая ў Сібір, традыцыя міжволі парушылася. І толькі з наступленьнем хрушчоўскай "адлігі", калі пачалі вяртацца былыя палітычныя вязьні і ссыльныя, гэтая традыцыя пакрысе адрадзілася. Аб тым, каб адзначаць сьвята публічна не было і гаворкі, але зьбіраліся на кватэрах, часьцей за ўсё ў Зоі і Аляксандра Кратовічаў, Зінаіды і Лявона Каралёў ці ў "лясной хатцы" Зоські Верас, і стараліся хоць так выправіць гэтую гістарычную несправядлівасьць.

Мы жывем у іншым часе – старых забаронаў больш няма. І мы карыстаем з гэтай магчымасьці. Але гэтым разам вырашылі ўспомніць, а магчыма і адрадзіць, традыцыю сьвяткаваньня Дня Волі на прыватным, так-бы мовіць, узроўні – так, як гэта рабілася за савецкім часам, калі ў Вільні яшчэ не было беларускіх арганізацыяў.

24-га сакавіка ўсклалі вянок да помніка ініцыятарам абвешчаньня незалежнасьці Беларусі братам Івану і Антону Луцкевічам на могілках Росы ў Вільні, а пазь дзень – 26-га сакавіка – сабраліся пад дахам Арла і Чайкі – Леакадзіі і сьв. пам. Кастуся Шышэяў, каб адзначыць гэтую знакавую падзею ў хатніх, нічым не абцяжараных умовах. Тым больш, што і гады, і здароўе ўжо не заўсёды дазваляюць надоўга пакідаць родныя сьцены. Ды і ахапіць хацелася як найбольшую колькасьць сябраў нашага і так нешматлікага таварыства.

Спачатку афармілі беларускім і летувіскім нацыянальнымі сьцягамі, вышытым Міраславай Русак гербам "Пагоня" ды кветкамі пакой, у якім мела адбыцца ўрачыстасьць, паглядзелі па Летувіскаму тэлебачаньню перадачу "Віленскі сшытак", якая была прысьвечаная Кастусю Каліноўскаму, і якую вядзе Тацьцяна Дубавец.

Пасьля перайшлі да асноўнай часткі нашае праграмы – Павал Саўчанка зачытаў "Зварот да беларускага народу з нагоды 92-х угодкаў БНР" Старшыні Рады БНР Івонкі Сурвілла, прасьпявалі гімн "Мы выйдзем шчыльнымі радамі" пад акампанэмэнт канцэртмайстаркі Тацьцяны Скарэне – унучкі рэпрэсаванага яшчэ ў 30-я гады мінулага стагодьдзя Язэпа Зімніцкага, ушанавалі хвілінай цішы памяць былых палітычных вязьняў і ссыльных, каго ўжо даўно няма сярод нас. Не забылiся і пра жывых.

Так, незаўважна, у размовах і ўспамінах прайшоў вечар. І хоць на дварэ ўжо даўно сьцямнела, разыходзіцца неахвотна. Адно, што час змушаў, а так бы, здаецца, яшчэ сядзелі і сядзелі. Спрыяў гэтаму і шыкоўна накрыты старанньямі Леакадзіі Шышэя, Вольгі Саковіч і Міраславы Русак стол. Але ня столькі ў стале справа – справа ў той шчырай сьвяточнай атмасфэры, якая панавала на працягу ўсяе імпрэзы.

Нездарма на разьвітаньне ўсе дружна вырашылі, што гэты пачын заслугоўвае ўсемагчымай падтрымкі і працягу.

*Валянцін СТЭХ, Старшыня Віленскага беларускага та-ва палітычных вязьняў і ссыльных*

## Іст-Брансўік, Нью-Джэрзі

*Заканчэньне з бачыны 1*

дзяржаўніцкай дзейнасьці, ненацыянальнай дзяржавай была БССР. Але поўная дзяржаўная незалежнасьць Беларусі была дасягнутая толькі ў 1991 годзе, калі БНФ, выступаючы на нацыянальнай платформе і выкарыстоўваючы парлямэнцкія мэтады, прывёў да аднаўленьня незалежнасьці. Нажаль, праз некалькі гадоў краіна апынулася ў рэчышчы варожым нацыянальнаму кірунку. Але нават антынацыянальная плынь і лукашэнкаўская ўлада адчувае, што незалежнасьць Беларусі трэба ўзмацняць і падтрымоўваць, альтэрнатывы гэтаму няма." Далей сп. Кіпель адзначыў, што ідэя дзяржаўнасьці спарадзіла іншы фэнамэн – дзяржаўніцкую дзейнасьць у замежжы. Бясспрэчна, праца на эміграцыі – працай для Беларусі. Эміграцыя зрабіла шмат для дапамогі і падтрымкі дэмакратычных незалежніцкіх сілаў, для будучай перамогі. Сп. Кіпель выказаў спадзяваньне, што неўзабаве "лёзунг-кліч Янкі Купалы "Жыве Беларусь" заменіца іншым лёзунгам: "Беларусь – жыве!"

З прамоваю пра мастацкае ўвасабленьне ідэяў незалежнасьці, беларускай дзяржаўнасьці праз стагодзьдзі выступіў мастак, скульптар Алесь Шатэрнік. Падчас урачыстай акадэміі прагучэлі песьні "Люблю наш край", "О Беларусь, мая шыпшына", "Магутны Божа". Была зачытаная і прынятая рэзалюцыя ўдзельнікаў урачыстага сходу. Завяршылася ўрачыстая акадэмія Беларускім нацыянальным гімнам "Мы выйдзем шчыльнымі радамі".

Затым прайшоў банкет, і пачаўся сьвяточны канцэрт. Правялі канцэрт славутыя выканаўцы з трыё сям'і Казак: Вялянціна Пархоменка, Алесь Казак і Вольга Казак. Гучэлі беларускія народныя сьпевы і мэлёдыі, "Ой у полі азярочка", "Дзеўчына-дзеўчынка, вясна-красна", "Цячэ вада ў ярок" ды іншыя, а таксама такія песьні, як "Акsamітны летні вечар" на музыку і словы С. Сокалава-Воюша. Прысутныя маглі таксама паслухаць гэтую песьню ў выкананьні самога аўтара, які ўзяў актыўны ўдзел у канцэрце, у тым ліку з шэрагам сваіх новых песень. Падчас канцэрту асаблівай папулярнасьцю карысталася песьня "Белая-белая, чыстая-чыстая Беларусь – радзіма мая" ў выкананьні Вольгі Казак, пад якую прысутныя выходзілі танчыць да сцэны.

Заля была аздобленая вялікім бел-чырвона-белым сьцягам, пашытым спн. Валяй Якімовіч, і намаляванай ёю "Пагоняй" на чырвонай харугве. Прысутныя мелі нагоду пазнаёміцца з творамі беларускіх мастакоў на выставе, якую падрыхтаваў у фае і залі сьвяткаваньня сп. Алесь Вінакураў.

Па ўражаньнях удзельнікаў, імпрэза прайшла надзвычай добра. Падзяка за яе арганізацыю і правядзеньне належыцца Юрку Азарку, Людзе Бакуновіч і Янку Грышкевічу. Падзяка за ўдзел у акадэміі Крысу Азарку, Тані Кулакевіч, Лене Грышкевіч і Сьветаславу Сокалаву. Падзяка за канцэрт – музыкам Валянціне Пархоменка, Алесю Казаку, Вользе Казак і Сяржуку Сокалаву-Воюшу. Падзяка за мастацкую выставу – Алесю Вінакураву. Падзяка Валі Якімовіч за сьцяг і Пагоню. Трэба таксама падзякаваць удзельнікам імпрэзы, якія прыехалі за многія сотні міляў з Масачусэтсу, Пэнсыльваніі, Мэрылэнду і Вірджыніі, каб узяць удзел у самым галоўным беларускім сьвяце.

*Віталь ЗАЙКА*



*Агульны здымак удзельнікаў сьвяткаваньня ў Іст-Бранўіку.*

Bielarus567c.qxd 4/10/2010 11:39 PM Page 5



# Беларусь за месяц

## Будаўніцтва АЭС

Беларусь прапанавала Францыі паўдзельнічаць у будаўніцтве АЭС. Пра гэта заявіў першы намесьнік прэм'ер-міністра Беларусі Ўладзімер Сямашка на сустрэчы зь дзяржаўным сакратаром па эўрапейскіх справах МЗС Францыі П'ерам Лелушам у Менску. "Ведаючы досьвед францускіх кампаніяў у галіне ядзернага будаўніцтва, атамных станцый, мы дапускаем магчымы ўдзел, напрыклад, такой кампаніі, як Areva, у рэалізацыі гэтага праекту ў Беларусі. Дзьверы адчыненыя", – сказаў Сямашка. Таксама першы віцэ-прэм'ер ня выключыў магчымасьць супрацоўніцтва з Францыяй у сфэры машынабудаваньня. У прыватнасьці, партнэрства "Рэно" і МАЗу.

АЭС будзе пабудаваная магутнасьцю 2,4 тыс. МВт. Увод першага энэргаблёку чакаецца ў 2016-м годзе. Станцыя будзе будавацца паводле праекту санкт-пецярбурскага інстытуту "Атамэнэргапраект". Генэральным падрадчыкам будаўніцтва выступіць расейскае дзяржаўнае ЗАТ "Атамбудэкспарт", падкантрольнае "Расатаму", якое рэалізуе міжурадавыя пагадненьні аб будаўніцтве аб'ектаў ядзернай энэргетыкі за мяжою.

На ўзьвядзеньне АЭС і інфраструктуры станцыі, паводле разьлікаў спэцыялістаў, неабходна 9 млрд. даляраў ЗША.

24 сакавіка на сустрэчы з намесьнікам старшыні КНР Сі Цзіньпінам у Менску Аляксандар Лукашэнка заявіў, што Беларусь гатовая супрацоўнічаць з Кітаем ва ўсіх сфэрах, у тым ліку ў будаўніцтве АЭС. У сваю чаргу расейскі амбасадар у Беларусі Аляксандар Сурыкаў 31 сакавіка на прэс-канфэрэнцыі ў Менску заявіў, што Расея можа адмовіцца ад удзелу ў будаўніцтве беларускай АЭС, калі праект будзе фінансаваць Кітай. Паводле ягоных словаў, адным з варыянтаў можа стаць будаўніцтва Расеяй самой АЭС, а іншым бокам – будаўніцтва інфраструктуры.

Беларускую АЭС мяркуецца пабудаваць у Астравецкім раёне (Гарадзенская вобласьць) непадалёку ад мяжы зь Летувой. У Летуве ўжо сабрана 22 тыс. подпісаў супраць яе будаўніцтва, бо атамная электрастанцыя будзе знаходзіцца за 55 км ад Вільні.

***Паводле БелаПАН***

## Дзень Волі – 2010

25 сакавіка ў Менску сьвяткавалі Дзень абвешчаньня незалежнасьці БНР. Як і летась, удзельнікі акцыі – іх было каля 2 тыс. – сабраліся ля будынку Прэзыдыюму Акадэміі навук. Арганізатары (Беларускі незалежніцкі блёк і Партыя БНФ) прасілі Менгарвыканкам дазволу прайсьці ходнікамі да сквэра Янкі Купалы, але гарадзкія ўлады традыцыйна прапанавалі звыклы маршрут Акадэмія навук – вуліца Сурганава – плошча Бангалёр.




*Фота Ў. Цярохіна*

Арганізатары адмовіліся ісьці на сумнавядомую плошчу, а застацца ля Акадэміі. Пасьля невялікага мітынгу частка ўдзельнікаў – сябры ініцыятываў "Маладая Беларусь" і "Вольная Беларусь" паспрабавалі прайсьці ў цэнтар, але шэрагі амонаўцаў не прапусьцілі іх ужо на першым скрыжаваньні. Таксама вельмі эпатажна паказала сябе група "Белая воля" (колькасьцю трыццаць чалавек), якая дайшла да ўнівэрсаму "Рыга". Затрыманьняў у гэты дзень не было. Затрыманьні былі толькі з раніцы 25 сакавіка ў рэгіёнах, з мэтаю не дапусьціць прыезду актывістаў на сьвяткаваньне ў сталіцу.

## Яшчэ адзін кандыдат

Лідэр Лібэральна–дэмакратычнай партыі Сяргей Гайдукевіч стварае блёк "Новая Беларусь – Адзінства". На зьезьдзе блёку і будзе зацьверджана ягоная праграма як патэнцыйнага кандыдата ў прэзыдэнты.

Гайдукевіч браў удзел у выбарах 2001 і 2006 гадоў, яго разглядалі як прыўладнага кандыдата для стварэньня бачнасьці дэмакратычнасьці выбараў.

На выбарах 2001 году ён набраў 2,48% галасоў. На выбарах 2006 года – 3,5%. Паводле Цэнтарвыбаркаму, Лукашэнка набраў тады 83,0%, Мілінкевіч – 6,1%, Казулін – 2,2%.

Пра жаданьне ўзяць удзел у выбарах ужо заявілі Андрэй Саньнікаў (каардынатар "Хартыі'97"), Алесь Міхалевіч (экс-намесьнік старшыні Партыі БНФ), Мікола Статкевіч (Народная грамада), Віталь Рымашэўскі (Беларуская хрысьціянская дэмакратыя) і фактычна Аляксандар Лукашэнка. Аляксандар Мілінкевіч заявіў, што вызначыцца ў траўні.

Прэзыдэнцкія выбары ў Беларусі пройдуць у пачатку 2011 году.

## Лябедзьку пераабралі

21 сакавіка ў Менску прайшоў XIII зьезд Аб'яднанай грамадзянскай партыі. У яго працы ўзялі ўдзел 112 дэлегатаў. Перавыбары старшыні прайшлі на безальтэрнатыўнай аснове. За Лябедзьку прагаласавалі 89 з 109 чалавек.



Анатоль Лябедзька ўзначальвае АГП з 2000 году. Найбольшы палітычны стаж на чале дэмакратычнай партыі толькі ў Станіслава Шушкевіча (Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада, з 1998 г.) і Зянона Пазьняка ў КХП – БНФ (з 1999 г.).

## Чарговы транш крэдыту

Беларусь атрымала ўжо пяты транш крэдыту МВФ памерам 670 млн. даляраў у рамках праграмы "стэнд-бай". Разьлічаная на 15 месяцаў дамоўленасьць памерам $2,46 млрд. была зацьверджаная Выканаўчай радай МВФ 12 студзеня 2009 году, а 29 чэрвеня таго-ж году аб'ём фінансавай падтрымкі з боку МВФ быў павялічаны да $3,52 млрд.

Першы транш крэдыту МВФ памерам $800 млн. Беларусь атрымала ў студзені 2009 году. Другі паступіў у ліпені – $680 млн. У кастрычніку летась Беларусь атрымала транш $699,5 млн. Чацьвёрты транш крэдыту памерам больш за $688 млн. паступіў у сьнежні. Такім чынам, агульны аб'ём прадастаўленых МВФ Беларусі фінансавых рэсурсаў у рамках праграмы склаў больш за $3,5 млрд.

У траўні сёлета чакаецца чарговая місія экспэртаў фонду, падчас якой будуць падведзеныя канчатковыя вынікі выкананьня праграмы "стэнд-бай", а таксама абмеркаваныя пытаньні далейшага супрацоўніцтва Беларусі з МВФ.

## Вандалы ў Курапатах



*Фота Радыё Свабода*

Невядомыя вандалы павалілі ў мэмарыяльным комплексе Курапаты пяць крыжоў. Чатыры зь іх на пачатку алеі, а вялізны крыж, на якім замацаваная ікона, быў прытулены да дрэва. Каля так званай "лавы Клінтана" сыляды вогнішча, раскіданае сьмецьце.

Гэта далёка ня першы акт вандалізму на месцы народнага мэмарыялу. Вандалы не абмяжоўваліся разбурэньнем крыжоў. Час ад часу міліцыя распачынае крымінальныя справы за разбурэньне магілаў ахвяраў сталінізму. Але злачынцаў дагэтуль ніразу не знайшлі.

Неаднойчы грамадзкасьць патрабавала ад уладаў усталяваць камэры назіраньня ў Курапатах, каб нарэшце спыніць акты вандалізму.

***Паводле Радыё Свабода***

## 4-е месца ў СНД

Паводле вынікаў 2009 году Беларусь займае чацьвёртае месца ў СНД па ўзроўні сярэдняга заробку, ён складае $356 эквіваленце. Беларусь апярэдзілі Расея ($628), Казахстан ($455) і Азэрбайджан ($371). Украіна заняла пятае месца — $239.

Сярэдні памер пэнсіі складае $150. Сярэдняя пэнсія ў Расеі – $204, ва Украіне — $129.

## Футбольны чэмпіянат

Стартаваў 20-ты чэмпіянат Беларусі па футболу ў вышэйшай лізе. Ягоная галоўная адметнасьць у тым, што ўпершыню бярэ самая малая ад пачатку колькасьць камандаў – 12. Скарачэньне за два гады колькасьці ўдзельнікаў з 16 клубаў да 12-ці зроблена для падвышэньня ўзроўню беларускага футболу. Каманды згуляюць у тры кругі, па 33 матчы. Скончыцца чэмпіянат краіны 20 лістапада.

Інтрыга першынства ў тым, ці стане барысаўскі БАТЭ ў пяты раз запар чэмпіёнам краіны і па агульнай колькасці тытулаў (1999, 2002, 2006, 2007, 2008, 2009 гады) дагоніць сяміразовага чэмпіёна краіны – менскае "Дынама". Менчукі апошнім разам наймацнейшай камандай краіны былі ў 2004 г.

## "Юнацтва" – чэмпіён

Мінскае "Юнацтва" ў пяты раз стала чэмпіёнам краіны па гакеі з шайбаю. У фінальнай сэрыі зь сямі матчаў падапечныя Міхаіла Захарава перамаглі салігорскі "Шахцёр".

"Юнацтва" стала пяціразовым чэмпіёнам краіны (2004, 2005, 2006, 2009, 2010).

***Уласны карэспандэнт***

# Ліст у рэдакцыю

Хачу выказацца адносна сытуацыяй, якая апошне заіснавала ў Фундацыі Крэчэўскага, дзе памяшчаецца аддзел БАЗА Нью-Ёрк. Фундацыя Крэчэўскага была заснавана каля 50 гадоў таму назад. За ўсе свае гады існаваньня гэты фонд стаў вядомы па ўсім сьвеце, дзе толькі не жылі беларусы, а нават і ў самой Беларусі. Грошы ішлі на выданьне кніжак, дапамогу палітыкам, розныя праекты нацыянальныя. У Фундацыі адбываліся розныя нарады, канфэрэнцыі, кангрэсы БАЗА, сэсіі Рады БНР, прымаліся госьці ад беларускіх арганізацыяў зь Беларусі, Аргентыны, Эўропы, Канады. Словам, была ўзаемная таварыская і прыемная атмасфэра, лучнасьць і паразуменьне.

Але вось апошне зьмянілася кіраўніцтва Фундацыі, ніхто ня ведае, як і чаму. Зьявіліся нейкія незразумелыя паводзіны новага кіраўніка сп. Вячкі Станкевіча. Ён загадаў зьмяніць замкі ў Фундацыю, і трэба кожны раз было дамаўляцца, каб адчынілі дзьверы для БАЗАўскіх сходаў. Тады новае патрабаваньне, каб Аддзелу БАЗА ў Нью-Ёрку аплочваў кожны свой сход. Далей болей, апошне ўжо памешканьне наагул зачынілі для аддзелу, пад маркай правядзеньня рамонту. Гэта ўсё ўводзілася аднаасобна, своволяй, без кансультацыі або папярэдняга паінфармаваньня кіраўніцтва аддзелу БАЗА-НьюЁрк.

Дзіўным ёсьць, што ўзгаданы сп. Станкевіч ёсьць таксама заступнікам старшыні Прэзыдыюму Рады БНР і старшынём Галоўнай управы БАЗА (хоць гэта ўжо пад пытаньнем, бо зрабіў парушэньні статуту БАЗА). Так ня можна захоўвацца асобе, хто ўважае сябе кіраўніком беларускай арганізацыі. Таксама гэта тычыцца такіх сябраў управы аддзелу як сп. Дворнік Валеры, хто зьмяніў па загадзе сп. Станкевіча замкі, а тады казаў прадстаўнікам управы свайго-ж аддзелу: "Хай аддзел купляе сабе будынак і там ставіць свае замкі". Які ён пасьля гэтага можа быць сябар управы, як ён пайшоў супраць свайго-ж аддзелу.

Становішча ў беларускім грамадскім асяродку ў Нью-Ёрку было дасюль спакойнае, таварыскае. Праводзіліся розныя імпрэзы, сьвяткаваньні, прыемна было быць на сходах аддзелу БАЗА. Але раптам з-за амбіцыяў адной асобы, да якой далучылася яшчэ некалькі, усё пайшло ўніз, і шкада, што нішчыцца праца ўсіх тых, што працавалі шмат год, каб стварыць моцныя падваліны для беларускай прысутнасьці тут, у Нью-Ёрку. Амбіцыі і памкненьне прыбраць уладу па ўсіх беларускіх арганізацыях адной асобай трэба спыніць, бо гэта стварае пагрозу для лучнасьці ўсяго беларускага грамадзтва ў Нью-Ёрку і шырэй на эміграцыі.

***С.***

Bielarus567c.qxd 4/10/2010 11:39 PM Page 6



# Вуліца – мая царква

Гэта назва адной з кніг Гі Жыльбэра – каталіцкага сьвятара, які жыве ў Парыжы і працуе з вулічнай моладзьдзю. Ён распавядае аб выбары свайго жыцьця, а таксама – як і ўва ўсіх сваіх кнігах – аб жыцьці, сьмерці, любові... аб прызначэньні і сэнсе жыцьця чалавека, хрысьціяніна, сьвятара... Вось як аб сваім пакліканьні кажа ён сам: "...Добра, што мой бацька сядзеў у той момант, калі я паведаміў яму, што зьбіраюся стаць парафіяльным сьвятаром – інакш ён паваліўся-б на месцы. Я рос сярод маіх пятнаццаці братоў і сёстраў, і нішто не прадракала, што ў мяне зьявіцца гэтая бязглуздая ідэя стаць сьвятаром. Часам мой бацька рваў на сабе валасы пры думцы аб тым, кім я зьбіраюся стаць. А гэтае нечаканае рашэньне – як... "як жаданьне пасікаць", – сказаў ён мне! (...) Пробашч маёй парафіі дазволіў мне прапусьціць два гады нядзельнай школы праз маю няўрымсьлівасьць на занятках, і я не адважваўся сказаць яму аб маім раптоўным і настойлівым жаданьні. Разам са сваім бацькам я паведаміў аб гэтым іншаму сьвятару."

І далей: "Думаю, сваім сьвятарскім пакліканьнем я абавязаны таму факту, што быў вельмі любы сваім бацькам. І потым, яны былі вельмі чулымі: яны не пакінулі ніводнага хворага, не прамінулі ніводнай трагедыі ў квартале, яны заўсёды былі гатовыя дапамагчы. Нашая сям'я была бедная; але мы валодалі самым вялікім багацьцем у сьвеце: усе мы былі аднолькава любыя. Гэтая любоў бацькоў нарадзіла ўва мне жаданьне любіць. Бог, відаць, выгравіраваў ува мне гэтае шалёнае жаданьне прысьвяціць яму сваё жыцьцё. Я гэта зразумеў шмат пазьней..."

Цяжка растлумачыць людзям, чаму выбіраеш тую ці іншую кнігу для друку. Чаму цябе прыцягвае той, а ня іншы, аўтар. Паспрабую, як магу, распавесьці гісторыю маёй зачараванасьці Гі Жыльбэрам (хаця сам ён, без сумневу, быў-бы не ў захапленьні ад гэтага спалучэньня словаў).

Першае маё (завочнае) знаёмства зь ім адбылося цяпер ужо шмат гадоў таму ў геаграфічным пункце пад назвай Шэметава – на беразе возера, дзе малады каталіцкі сьвятар а. Пётр (прозьвішча ня памятаю – ды і наўрад ці і тады яго ведала) распавядаў дзецям, што адпачывалі ў парафіяльным летніку, пра сьвятара, які жыве ў Парыжы і ходзіць у джынсах і з доўгімі валасамі... пра чалавека, які, вярнуўшыся з вайны, вырашыў стаць сьвятаром і працаваць на вуліцы... Дзе пра яго можна прачытаць, а. Пётр ня ведаў.

Ня ведаў гэтага і хросны бацька маіх дзяцей, які пазьней дадаў да легендарнага вобразу сьвятара зьвесткі аб тым, што ён адпраўляе ў накаўт вулічных хуліганаў, благаславіўшы іх папярэдне знакам крыжа.

Зьвесткі гэтыя часткова пацьвердзіліся, часткова – не, пасьля таго як я прачытала нарэшце дзьве кнігі Гі Жыльбэра ў польскім перакладзе: "Сьвятар сярод бандытаў" і "Да канца" (або "Цалкам"). Іх мне даў а. Робэрт Кшывіцкі – наш барысаўскі сьвятар – зусім незадоўга да сваёй высылкі зь Беларусі ў канцы 2005 году.

Уражаньне было такое, што вельмі захацелася падзяліцца гэтым з іншымі людзьмі. І аўтар, і ягоная мова, і самое тое, аб чым ён піша, настолькі не адпавядалі "стандартнаму" "маляванаму" вобразу "сьвятара", "эвангелізатара", і адначасова усё гэта было сапраўднае, жывое, чалавечае... Яно шмат у чым пераклікалася з тым, што я бачыла кожны дзень у працы айца Робэрта...

Служэньне Гі Жыльбэра ўнівэрсальнае; і тое, што ён піша, адрасаванае ўсім: французам, людзям іншых краінаў, хрысьціянам, нехрысьціянам, настаўнікам, бацькам... Заўсёды і ўсюды трэба бараніць годнасьць і правы чалавека: права на жыцьцё; права на годнае існаваньне; права быць самім сабою... Апынуўшыся на алжырскай вайне, нядаўны сэмінарыст Гі Жыльбэр пачынае гэтае змаганьне – яно сталася справай усяго жыцьця...

"...Наш капраль вырашыў караць тых, хто прыходзіў апошні. Звычайна на буксіры апыналіся самы малы і самы тоўсты. Мы з адным сьвятаром-пачаткоўцам вырашылі спыняцца за некалькі сантымэтраў да лініі прыбыцьця і йсьці за тымі, хто адставаў. За кожным разам гэта каштавала нам мыцьця посуду ў ледзяной вадзе. Пасьля дваццатага разу капраль, адчуўшы, што яму абрыдла, пакінуў гэтую завядзёнку. Гэта былі нашыя першыя бітвы, і, трэба адзначыць, нямарныя..." Пасьля доўгіх і цяжкіх змаганьняў і выпрабаваньняў "мы зь сьвятаром-пачаткоўцам і вайсковым камуністам заўважылі, што за час нашай прысутнасьці ў гэтым батальёне не катавалі і не забілі ніводнага чалавека. Адная нашая прысутнасьць рабіла чалавека больш чалавечным. (...) Гэта да канца жыцьця нарадзіла ўва мне жаданьне змагацца заўсёды там, дзе я знаходжуся, штоб ня здарылася і штоб пра мяне ня думалі іншыя, змагацца з тымі, хто змагаецца за вызваленьне чалавека."

Вызваленьне чалавека. У большасьці гэтыя словы асацыююцца з чым заўгодна, адно не з хрысьціянствам, вераю і сьвятарствам. І занадта часта нябеспадстаўна. Гэтая трагічная неадпаведнасьць сталася прычынаю надлому ў жыцьці Гі Жыльбэра: "Я думаў пакінуць сьвятарства. Дзесяць гадоў я чытаў, слухаў, сьпяваў Эвангельле. Я знаходзіў яго цудоўным, вельмі цудоўным. Але з часам розьніца паміж тым, што я чытаў, і тым, што бачыў у жыцьці маіх настаўнікаў, падалася мне занадта значнай. У




Эвангельлі гаварылася аб простым рабочым, які падарожнічаў па краіне з купкай сяброў. Яны дзяліліся тым, што ў іх было, апекаваліся і вылечвалі хворых. Ён распавядаў гісторыі, якія казалі аб любові й вызваленьні. Яж быў у палоне правілаў, часта абсалютова абсурдных, дробязных (...)... Радасьць, якой мне казалі жыць, ніколі не праглядала на тварах тых, хто намі кіраваў. Таму я вырашыў усё пакінуць. Я скарыстаў з магчымасьці зьехаць у Алжыр. Гэта быў вокамгненны шок, рашучы. Гэта было другое дыханьне, якім я жыву сёньня. (...)

Але асабліва важнае тое, што потым, дзякуючы судачыненьням з арабамі, якіх я даглядаў, я адкрыў жывое Эвангельле. Я ані разу ня выйшаў з хаціны без таго, каб мне не аддалі апошнюю порцыю кускуса. Яна заўсёды пакідалася для іншаземца. Я зноў прыняў рашэньне стаць сьвятаром; і на знак удзячнасьці да арабскага народу па сканчэньні службы паступіў у сэмінарыю ў Алжыры."

Тое, што напісана Гі Жыльбэрам у 1980 годзе, актуальна і сёньня ўва ўсім сьвеце. Актуальна сёньня і для Беларусі. Ён разважае аб тым, што зьяўляецца справаю царквы ў сучасным сьвеце, і прыводзіць факты зь нядаўняга мінулага, якія перагукаюцца з фактамі сёньняшняга дня.

"...Адзін знакаміты генэрал сказаў біскупу, які выступаў супраць гандлю зброяй, каб той займаўся толькі сваімі справамі. Без сумневу, для генэрала справамі царквы былі закрыстыі, прапахлыя цьвільлю, нунцыятуры, пастырская тэалёгія і ўсё астатняе. (...)

Зброя і тое, як яе выкарыстоўваюць у міжнародным гандлі, – гэта датычыць Царквы. Алькагольныя напоі, якія прадаюцца на рукі, часта малалетнім, – гэта датычыць Царквы. Адмовіцца ад капіталістычнага сьвету, які багатым дазваляе ўзбагаціцца, а бедным зрабіцца яшчэ бяднейшымі, – гэта эвангельскае патрабаваньне да ўсіх хрысьціянаў і Царквы, і гэта таксама датычыць Царквы. Зьбіцьцё дубінкамі ў камісар'ятах людзей, арыштаваных на вуліцах гарадоў, – гэта датычыць Царквы... (...)

На жаль, справай царквы быў і дагэтуль застаецца кампраміс з уладай. Мы ніколі ня выкрыем маладушша некаторых рэлігійных служкаў, якія ўступаюць у змову зь мясцовымі ўладамі, аддаючы свае даручальніцтвы людзям палітыкі, часта ня вартым гэтага званьня. Я часта заўважаў, як Царква схіляецца ўправа, калі ля ўлады знаходзяцца правыя, і часам улева, калі ля ўлады левыя. (...)

Прысутнасьць М. Відэлы, забойцы і прэзыдэнта Аргентыны, на імшы ўзьвядзеньня ў сан Яна Паўла І не дазваляе Царкве прызнаць сябе салідарнай з аргентынскімі пакутнікамі. Яна заўсёды можа публічна асуджаць катаваньні, але гэта нічога ня дасьць да тае пары, пакуль яна не разарве дачыненьні з катамі. Яна можа выдаць паўнамоцтвы найгоршым рэжымам і ўрэшце зрабіцца нявольніцай гэтых "прэзыдэнтаў, якія называюць сябе хрысьціянамі", якія з акрываўленымі рукамі ўсьсядаюць у цэнтры амфітэатру моцных гэтага сьвету і на папскіх імшах. (...) Як жанчыны, мужы якіх былі закатаваныя і забітыя ў Аргентыне, бачылі М. Відэлу ката і злачынцу Аргентыны, які зьяўляўся на маленькіх экранах у атачэньні сьвіты кіраўнікоў дзяржаваў, што віталі ўзьвядзеньне ў сан Яна Паўла І у часе імшы на Эўрабачаньні? Якая поўха, нанесеная хрысьціянам і ўсім астатнім. Можна было-б пашукаць самага апошняга злачынцу ў турме Рыму, каб пасташвіць яго побач з палкоўнікам Відэлам. Гэта была-б цудоўная пара, і паміж імі не было-б ніякіх адрозьненьняў!"

Якая красамоўная паралель з зусім нядаўняй сустрэчай Папы Бэнэдыкта XVI з Аляксандрам Лукашэнкам!

"Я ледзь быў не вярнуў назад свае сьвятарскія паўнамоцтвы свайму біскупу, калі даведаўся, што Павал XVI прызнае рэжым генэрала Піначчта на трэйцім месцы пасьля Расеі і яшчэ нейкай краіны. У гэты-ж самы час па вуліцах Сант'яга цяклі рэкі крыві. Калі яму з гэтай нагоды зрабілі рэзкі папрок, у Царквы знайшоўся імгненны і лёгкі адказ: "Гэта каб не дапусьціць яшчэ большага кровапраліцьця". Мяне гэта вельмі зьдзівіла. Прароцкі жэст разрыву з катам на вачах усяго сьвету зьнішчыў-бы рэжым... І якая шалёная радасьць для прыгнечаных рэжымам – пачуць гэта з вуснаў самога галавы хрысьціянаў. Калі-б у Паўла XVI была гэтая мужнасьць у дачыненьні да Гітлера, ён-бы, вядома-ж, скончыў сваё жыцьцё ў якім-небудзь канцлягеры. Але якая слава для Царквы, калі сорак гадоў пасьля такая колькасьць папрокаў нясецца на адрас дыпляматы Царквы, якая ведала пра злачынствы, што зьдзяйсьняліся ў лягерах сьмерці, і якая забівала сама сябе, верачы, што яе маўчаньне залагодзіць Гітлера...(...)

Нам патрэбная прарочая Царква, якая не баіцца пацярпець, вызваляючы чалавека. Нам патрэбная Царква, у якой ёсьць мужнасьць сказаць і перайсьці да зьдзяйсьненьня слова, г. зн. да дзеяньня. Гэта ўтварала захаплялны эфект у пляне чалавечага і рэлігійнага сьветапогляду ў Лацінскай Амэрыцы, калі сьвецкія, сьвятары і біскупы вырашыліся бараніць і ўрабляць зямлю разам зь сялянамі. Некаторыя заплацілі за гэта крывёю. Гэта справядлівая ўзнагарода тых, хто ад пачатку Царквы адважыўся перайсьці ад ідэяў да дзеяньняў.

Няма нічога мацнейшага. Ісус Хрыстос паказаў нам шлях, першым заплаціўшы за гэта сваім жыцьцём."

Гэта далёка ня ўсё пра Гі Жыльбэра і ягоную кнігу, што хацелася-б зьмясьціць на газэтнай бачыне. Па-за яе дапушчальным аб'ёмам застаўся расповед уласна пра штодзённую працу і жыцьцё на вуліцы, пра маладых людзей, зь якімі ён працуе як сьвятар і выхавўаца, але перш за ўсё як проста сябар, пра беднасьць і багацьце, пра самаўпраўства паліцыі і пра турмы, пра іх вязьняў і наглядчыкаў, якія парадаксальным чынам разьдзяляюць зь імі зьняволеньне, пра салідарнасьць людзей, пра пашану да чалавека, кім-бы ён ні быў... — усё адно, каб мець аб усім гэтым уяўленьне, трэба прачытаць кожны разьдзел, кожны радок...

Але тое, што нехта гэта прачытае, яшчэ ня кажа аб патрэбнасьці гэтай кнігі. Сам Гі Жыльбэр лічыць, што ў тым, каб толькі прачытаць і толькі ведаць і захапляцца, няма сэнсу – прачытаўшы, трэба пачынаць рабіць: зьмяняць жыцьцё і даваць надзею там, дзе мы ёсьць.

Я хачу надрукаваць гэтую кнігу па-беларуску і ў Беларусі – каб людзі прачыталі і захацелі зьмяніць сваё жыцьцё. Каб, захацеўшы, пачалі гэта рабіць.

Пераклад з францускай на маю замову зрабіла Натальля Дарашкевіч. Існуе вусная дамоўленасьць на выданьне 500 або 1000 асобнікаў з прыватным выдавецтвам у Беларусі і францускім выдавецтвам-праваўладальнікам "Editions Stock". На дадзеным этапе я шукаю сродкі на выданьне. Калі камусьці з чытачоў "Беларуса" гэта будзе цікава, калі ласка: буду ўдзячная за дапамогу; і, вядома, імёны ўсіх, хто дапамог, пры іх жаданьні будуць зьмешчаныя ў кнізе.

***Натальля БАЯРЫН***

***Жадаючыя дапамагчы ў выданьні кнігі Гі Жыльбэра па-беларуску, калі ласка, дасылайце свае ахвяраваньні на адрас рэдакцыі "Беларуса". Усе сабраныя сродкі будуць перададзеныя выдаўцу.***

Bielarus567c.qxd 4/10/2010 11:39 PM Page 7




# Весткі й Паведамленьні

Нью-Ёрскага аддзелу Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня
Viestki j Paviedamlenni
Belarusan American Association, Inc.
166-34 Gothic Drive, Jamaica, N.Y. 11432 Сусьветнае сеціва: www.baza-belarus.org № 4 (531)


## Сакавіцкі сход нью-ёрскага аддзелу БАЗА

У нядзелю, 14 сакавіка, прайшоў чарговы, сакавіцкі сход Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА. Напачатку сходу старшыня аддзелу сп. Віталь Зайка, выступіў з паведамленьнем аб падзеях у Беларусі за апошні месяц. У ліку ўзгаданых былі факты ціску на Малады Фронт ды іншыя арганізацыі, якім адмаўляецца рэгістрацыя, апошнія навіны ў вылучэньні кандыдатаў на мясцовыя выбары, навіны ў справе прадпрымальніка Мікалая Аўтуховіча, "дыктатарская" прыватызацыя, адмаўленьне Лукашэнкі ад запросінаў на сьвяткаваньне ў Летуву і ягоны візыт у Вэнэсуэлю, сустрэча польскіх афіцыйных асобаў зь беларускімі палітыкамі, павелічэньне курсу асноўных валютаў да беларускага рубля ды іншае.

Затым былы старшыня Галоўнай управы БАЗА сп. Антон Шукелойць выступіў з гутаркай пра ролю эміграцыі ў дапамозе дасягненьня незалежнасьці Беларусі. Ён адзначыў, што ў выніку падтрымкі беларускай прысутнасьці на чужыне, працы з амэрыканскімі ды іншымі ўладамі вольнага сьвету адносна інфармаваньня пра становішча ў Беларусі, акцыямі ў падтрымку дысыдэнтаў а пазьней – рухаў, такіх як Беларускі Народны Фронт, беларуская эміграцыя падрыхтавала глебу для хуткага дыпляматычнага прызнаньня беларускай незалежнасьці ў 1991 годзе. Сп. Шукелойць таксама адзначыў, што "фактычна мы вайну выйгралі, бо зьявілася Беларусь на міжнароднай арэне, у ААН, пашырылася поруч зь беларускай прысутнасьцю і веда пра Беларусь у сьвеце, непрыяцелям Беларусі стала значна складаней заяўляць, што Беларусь гэта частка Расеі або нечага іншага. І праз 50 гадоў увесь сьвет прызнаў, што Беларусь ёсьць незалежная сувэрэнная дзяржава". Сп. Шукелойць таксама адзначыў, што ў гутарках зь Зянонам Пазьняком той таксама падкрэсьліў, што нават у сёнешніх умовах унутранай акупацыі Беларусь ёсьць незалежная дзяржава, а не калёнія або пратэктарат Масквы. Вызначальнымі чыньнікамі тут ёсьць тэрыторыя і межы, мова, дзяржструктуры і дзяржатрыбуты, войска, і г. д. Сп. Шукелойць узгадаў, як у 1990 годзе высылаў яшчэ тады фактычна камуністычнаму ўраду Беларусі віншаваньні з нагоды абвешчаньня дзяржаўнага сувэрэнітэту Беларусі.

Сп. Шукелойць прыгадаў сустрэчы з польскім этнолягам Ганнай Энгелькінг, якая праводзіла палявыя досьледы ў Беларусі ў галіне этнаграфіі й этналёгіі, і як ён зазначыў ёй, што каталіцкасьць вялікай колькасьці беларусаў трактуецца часта як падстава для доказу польскіх каранёў, і як ён яшчэ ў гімназічныя часы пабачыў памылковасьць карыстаньня мовы катэхізацыі ў якасьці доказу польскасьці насельніцтва. "Пацеры цярэбяць для палякаў дарогу на ўсход". Пры гэтым ігнаравалася, якая на самой справе мова штодзённага ўжытку, мова ў хаце і на полі.

Пасьля ў разьдзеле "Рознае" адбылося знаёмства з гасьцямі аддзелу, пераважна моладзьдзю, якая адносна нядаўна прыехала ў Амэрыку з самых розных мясьцінаў Беларусі. Знаёмствы мелі шанец замацавацца пасьля афіцыйнай часткі сходу пры кубку кавы і печыве.

**Віталь ЗАЙКА**

> **Сходы нью-ёрскага аддзелу БАЗА праходзяць у другую нядзелю кожнага месяца. Кіраўніцтва Фундацыі імя П. Крэчэўскага, дзе звычайна праводзіліся сходы, паведаміла, што памешканьне закрываецца для капітальнага рамонту ў красавіку сёлета. Новае памешканьне пакуль ня знойдзена. Каб даведацца месца правядзеньня чарговага сходу, сачыце, калі ласка, за аб'явамі на сайтах БАЗА (http://baza-belarus.org) і газэты "Беларус" (http://www.bielarus.org)**

## Ці будзе надзвычайны Кангрэс БАЗА?

У "Беларусе" № 566 была надрукаваная заява групы дэлегатаў апошняга Кангрэсу БАЗА з патрабаваньнем склікаць надзвычайны Кангрэс.

Ніжэй друкуем адказ Галоўнай управы БАЗА, дасланы падпісантам узгаданай заявы.

### У справе Надзвычайнага Кангрэсу БАЗА

Галоўная управа БАЗА на сваім пасяджэньні 17 студзеня 2010 г. разгледзела заяву наконт скліканьня Надзвычайнага Кангрэсу БАЗА, прысланую 10 сьнежня 2009 г., і зрабіла наступную высонову:

*З пададзеных вамі прычынаў ніводная ня носіць надзвычайны характар, усё пералічанае мае дачыненьне да мінулага справаздачна-выбарчага Кангрэсу 30 траўня 2009. Фактычна, вы патрабуеце паўторнага правядзеньня справаздачна-выбарчага Кангрэсу. Аднак, ніякіх паўторных кангрэсаў ў Статуце не прадугледжана. Усе прэтэнзіі да вядзеньня Кангрэсу і яго правамоцнасьці выказваюцца непасрэдна пад час Кангрэсу, абмяркоўваюцца і рашэньні прымаюцца галасаваньнем. На мінулым Кангрэсе названыя вамі прэтэнзіі былі выказаныя і абмеркаваныя. Нагадваем, як былі тады разьвязаныя ўзнятыя ў заяве пытаньні:*

*а) Кангрэс не палічыў патрэбным ўнесьці зьмены ў прапанаваны папярэдні Парадак дня, што меў права зрабіць.*

*б) Кангрэс, як вышэйшая інстанцыя, прыняў больш дакладную пастанову наконт абмежаваньня тэрмінаў старшыняў, такім чынам зьмяніўшы пастанову Галоўнай управы.*

*в) Працэдура прыняцьця новых сяброў не акрэсьленая пісьмова і дакладна ў ніводным Аддзеле БАЗА. Кангрэс прыняў справаздачу мандатнай камісіі наконт правамоцнасьці прысутных дэлегатаў і дасланых упаўнаважаньняў. Не было выказана ніякіх прэтэнзій да гэтага рашэньня Кангрэсу.*

*г) Справаздача Рэвізійнай камісіі залучаецца. Старшыня Рэвізійнай камісіі, які падрыхтаваў гэтую справаздачу, ня змог яе прачытаць, бо ня быў прысутны на Кангрэсе з прычыны нечаканай хваробы.*

*Такім чынам, на Кангрэсе БАЗА 30 траўня 2009 году ніякіх істотных парушэньняў Статуту БАЗА не было дапушчана.*

*Галоўная управа не будзе склікаць Надзвычайны Кангрэс на падставе згаданай вышэй заявы, бо на бачыць абгрунтаваных прычынаў дзеля такога кроку і дастаткова важнай сытуацыі, якая патрабавала б скліканьня такога форуму.*

Ад Галоўнай управы Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня (БАЗА)

***Старшыня Вячка Станкевіч***
***Сакратар Тацьцяна Красоўская***

-----------------

У Заяве аб патрэбе Надзвычайнага Кангрэсу не былі выкананыя нават фармальныя патрабаваньні. Статут патрабуе, каб заява была дасланая Галоўнай управе з асабістымі подпісамі пазначаных пад ёю асобаў, аднак гэта не было зроблена.

Высьветлілася, што некаторыя з тых 10 чалавек, чые прозьвішчы былі пастаўленыя пад заявай, самой заявы ня бачылі і некаторыя нават не разумелі яе сутнасьць, бо атрымалі ад ініцыятараў няправільную інфармацыю. Ёсьць тыя, хто пажадалі зьняць свае прозьвішчы, даведаўшыся пра гэты дакумэнт. Тры асобы з падпісаных увогуле не былі фізычна прысутнымі на Кангрэсе і ня могуць сьведчыць, што ён адбываўся з парушэньнямі.

Такім чынам, марнаваць час цэлай арганізацыі і паўтараць мінулы Кангрэс таму, што некалькіх чалавек не задаволілі ягоныя вынікі, і яны вырашылі іх аспрэчваць, няма ніякай падставы.

Калі ў будучыні будзе патрэба і будуць на гэта падставы, Галоўная управа будзе гатовая склікаць Надзвычайны Кангрэс.

***Старшыня Галоўнай управы Вячка СТАНКЕВІЧ***

---

У лісьце сп. Станкевіча фактычна замоўчаныя асноўныя моманты, узгаданыя ў Заяве аб патрэбе надзвычайнага Кангрэсу, у адказ на якую і напісаны ліст сп. Станкевіча.

Нагадваю, у Заяве была абгрунтаваная патрэба надзвычайнага Кангрэсу дзеля шэрагу сур'ёзных парушэньняў Статуту БАЗА ды іншы хібаў, менавіта неправамоцнага дэлегаваньня галасоў аддзелам БАЗА ў Кліўлэндзе, неналежна прадстаўленых пытаньняў парадку дня і адвольнага трактаваньня Статуту сп. Станкевічам ды іншае. Цяпер па пунктах з ліста сп. Станкевіча:

**А.** У пытаньні пра парадак дня быў груба парушаны Статут, бо ўнесеныя менш як за тыдзень да пачатку Кангрэсу дадатковыя пытаньні павінны былі быць вынесеныя на разгляд дэлегатаў з поўным тэкстам прапануемых фармулёвак або папярэднім Кангрэсам, або перанесеныя на разгляд наступнага Кангрэсу, як гэта прадугледжвае Статут.

**Б.** Пастанова наконт абмежаваньня тэрмінаў старшыняў была прапанаваная сп. Станкевічам да галасаваньня як ужо прынятая Галоўнай управай і толькі патрабуючая зацьверджаньня Кангрэсам без дыскусіі. Акрамя таго, што гэтыя сьцьверджаньні сп. Станкевіча ніяк не падмацоўваюцца Статутам, на Кангрэсе адсутнічалі як пратакол, так і сам тэкст гэтай пастановы Галоўнай управы; замест іх разглядаліся вусныя заявы самога сп. Станкевіча, што ідзе насуперак як Статуту, так і нармальнай практыцы функцынаваньня любой арганізацыі.

**В.** Сьцьвярджаючы, што працэдура сяброўства не акрэсьленая пісьмова, сп. Станкевіч забываецца на свой уласны ліст ад 30 красавіка 2009 г., разасланы ў аддзелы БАЗА. Там ён пісаў, што выбіраць дэлегатаў і быць выбранымі дэлегатамі маюць права сябры, якія ўвайшлі ў структуры БАЗА і заплацілі складкі ўключна па 2008 год для ранейшых сяброў і за 2009 год для новых сяброў. Пры гэтым пасьля Кангрэсу высьветлілася, што ў аддзеле БАЗА ў Кліўлэндзе (Агаё), які пераслаў свае 5 галасоў сп. Станкевічу, на момант правядзеньня абодвух апошніх Кангрэсаў БАЗА не рэгістравалася сяброўства і адсутнічала сыстэма аплаты сяброўскіх складак.

**Г.** Справаздача рэвізійнай камісіі, складзеная аднаасобна яе старшынём, і не прадстаўленая на Кангрэс, на самой справе ёсьць толькі канстатацыяй сумы грошай на рахунку Галоўнай управы, і колькасьці паседжаньняў і лістоў карэспандэнцыі. Ня ўлічаныя думкі іншых сябраў рэвізійнай камісіі.

Усе асобы, імёны якіх стаяць пад Заявою, атрымалі тэкст заявы і поўную інфармацыю па ўсіх пытаньнях, зьвязаных зь ёю, і ўсе асобы выказалі жаданьне далучыцца да яе. Частка зь іх зрабіла гэта праз электронныя сродкі. Ніводная з гэтых асобаў на момант напісаньня цяперашняга ліста не зьвярталася афіцыйна, неафіцыйна або ў любы іншы спосаб, аб адкліканьні свайго голасу.

Але ў любым выпадку сп. Станкевіч мусіць кіравацца пададзеным у Заяве патрабаваньнем ад адзінаццаці дэлегатаў, якія да яе далучыліся, аб скліканьні надзвычайнага Кангрэсу, так як ён атрымаў яе ў сьнежні 2009 году, а не цягнуць час, ужываць закулісныя манэўры і спробы постфактум паставіць пад пытаньне слушнасьць подпісаў, што стаяць пад Заявою.

***Віталь ЗАЙКА, дэлегат Кангрэсу БАЗА***

Bielarus567c.qxd 4/10/2010 11:39 PM Page 8



## Палеміка

# Тое што любім – самыя губім

***Артыкул друкуецца ў аўтарскай рэдакцыі***

*“А наш вораг нам відны, бо наш вораг – гэта мы”.*
***Паводле H. L. Mencken’a***

Дажыўшы да старасьці пераконваешся, што папраўдзе лепш памятаецца былое ў маладосьці, як шмат чаго, што сталася пазьней, або й нядаўна. Гэтая праўда датычыць ня толькі жыцьцёвых падзеяў і здарэньняў, але й мовы, якой думаеш, гаворыш ды пішаш.

У маім выпадку, пасьля даволі добрага ўведаньня яшчэ змалку моваў нашых суседаў-займітаў із Усходу ды Захаду, жыцьцёвыя абставіны прымусілі падвучыцца й да цяпер забыцца яшчэ пару заходня-эўрапэйскіх моваў, ды ўрэшце, хоць і ня зусім беззаганна, але ўжо да канца жыцьця звыкаць да думаньня, гаворкі ды пісаньня па-ангельску.

Усе гэтыя навукі нейкім чынам, аднак, мясьціліся й месьцяцца ў мазгавых загарадках паўзбоч галоўнага мейсца, якое там праз усё жыцьцё займае валодная над думаньнем ад нараджэньня родная беларуская мова – мова ня ўведаная ад якіхколечы настаўнікаў ці з падручнікаў, а амаль уссаная з маціным малаком і ўрослая ў розум праз побыт у сялянскім асяродзьдзі ўмалку ды ў маладосьці.

І чым болей маленства й маладосьць адыходзяць у даль, тым яны становяцца даражэйшыя, ды іхны нясьцертны сьлед у сьведамасьці – родная мова, зь ейнае веды абяртаецца ў любастнае пачуцьцё да яе, якое раняць, ды разьятрываюць як собскія памылкі, гэтак і неахайнасьць ды няўмецтва карыстацца ёю бальшыні нашых суродзічаў, ня толькі нявысака адукаваных, але й літаратараў, паэтаў, дзеячоў ды павадыроў, што няраз больш плачуць па ёй як бароняць яе собскім прыкладам ад зьнішчальнага маскоўскага наступу.

Гэтае, шчымлівае на кожны зачэп ягонае ўражлівасьці да вытняў ці зьвіхаў, пачуцьцё, што па-ангельску называецца “the sensitivity of the native speaker”, а ў перакладзе на нашую мову хіба “чуйкасьць адмалкавага гаварца па-свойску”, вельмі дакучлівая й непрабачлівая свомасьць сьведамасьці, што ў нашых сучасных абставінах не перастае біць у звон на асьцярогу ад бясконцых уверадаў.

Моўных-жа ўверадаў у нас, не кранаючы нават бязьмежжа нячутных ужо нашым зчужэлым вушам агрэхаў у гутаркавай мове, а ў газэтах, часапісах, сеціве й кніжных выданьнях гэтулькі, што нямала з таго, што пішацца й друкуецца, складзенае, з большага, зь беларускіх словаў, але не на беларускай мове.

На першы прыклад гэтае бяды возьмем хоць-бы загалоўкі дзьвёх патрыятычных і быццам абарончых роднае мовы газэтаў, што якраз апынуліся перад вачыма, адна завецца *“Наша Слова”*, другая *“Наша Ніва”* зь ейным нядаўнім выданьнем *“Наша страва”*. Усе тры назовы складзеныя з двох словаў – займеньніка й назоўніка, назоўнікі, аднак, адзін ніякага роду, а два жаночага, што не перашкодзіла рэдакцыям ўв абодвых выпадках паставіць уперадзе назоўнікаў нянаскую, бо ўсечаную хворму прыналежнага займеньніка жаночага роду *“наша”*, хоць трэба было-б напісаць ці надрукаваць *“Нашае Слова”* й *“Нашая Ніва”* ды *“Нашая страва”*.

Калі-ж зайшла ўжо гутарка праз назовы ці загалоўкі выданьняў, дык падобную няпісьменнасьць знайходзім і ў гэткіх мудрагельствах выдаўцоў, як *“Газета Слонімская “*, *“Голас царквы беларускай”* ці *“Ўспаміны сэрца майго”*, дзе ня толькі займеньнік, але й прыметнікі стаяць у нязгодных з нашай мовай мейсцах.

Пачаўшы гутарку з займеньнікаў, нельга яшчэ ня ўспомніць, што ў нашым друкаваным слове амаль зьвяліся асаблівыя для нашае мовы прыналежныя займеньнікі *“мой, мая, маё, мае”*; *“твой, твая, тваё, твае”*; *“ягоны, ягоная, ягонае, ягоныя”*; *“ейны, ейнае, ейныя”*; *“іхны, іхная, іхнае, іхныя”*, замест якіх наўзор суседзкіх моваў ставіцца *“яго, яе, іх”*, або *“свой, свая, сваё, свае”*, як напрыклад: “*я паважаю свайго* (а трэба было-б напісаць *майго) бацька, я люблю сваю* (а трэба *маю) маці, узялі яго* (а трэба *ягонага) брата, паклікалі яе* (а трэба *ейную) маці, пазналі іх* (а трэба *іхных) бацькоў*, або:*“спытаў у свайго* (а трэба *ягонага) бацька, прасіла ў свае* (а трэба *ейнае) маці, калыхала сваё* (а трэба *ейнае) дзіцё, дзяды песьцілі сваіх* (а трэба *іхных) унукаў*”.

Гэта ня значыць, што прыметніку *“свой, свая, сваё, свае”* няма мейсца ў нашай мове, але ім трэба карыстацца толькі тады, калі неабходна адзначыць розьніцу паміж собскім і чужым, як, напрыклад, *“свая хатка, як родная матка”*.

Яшчэ адзін чужынскі сьлед у мове нашых пісараў – гэта скарыстоўваньне ў сказах у ролі злучных словаў неадпаведных пытальных займеньнікаў, як напрыклад:”*шапка, якую ён купіў у краме*”, замест *“шапка, што ён купіў у краме”*, але *“шапка, якое (што такое) ня знойдзеш на рынку”*.

Псуецца друкаванае слова й займеньнікамі *“сама, само, самі”*, сьледам бо за як-трэбнымі ”*сам скасіў сенажаць*”, *“дзеўка сама зжала загон”* пішуць яшчэ *“дзіця хадзіла само (а не самое)*, ды *“мы, вы, яны (зрабілі) самі*, замест *“мы, вы, яны (зрабілі) самыя”*.

Упоруч з гэтым зьяўляецца яшчэ й *“той сам”*, дзе лепш было-б паставіць *“той самы (дуб)*, бо кажацца-ж *“тая самая (ліпа), тое самае (зельле)*.

*Урэшце* й пытальны займеньнік *“каторы, каторая, каторае, каторыя”* не застаецца бяз пярэкруту, бо ім, замест толькі пытаньня, на якое бывае адказ, напрыклад, *“першы, пяты, дзясяты”*, або з папярэднімі *“той, тая, тое, тыя”* + *“што”* , да якіх дадаецца азначэньне розьніцы нейкага слова ад кагось ці чагось іншага, як напрыклад, *“той чалавек, што (стаіць) збоку, тая дзяўчына, што (хараша) пяе, тое дзіцё, што (горка) плача, тыя людзі, што (стаяць) у чарзе”*, дзе-якія нашыя “моваведы” карыстаюцца як злучным словам у сказах, як напрыклад, *“Войча Наш, каторы ёсьць у нябёсах ...”*, дзе лепш было-б напісаць, ці сказаць або запяяць *“Войча Наш, Той, што на небе Ты,* і ня ёсьць, а *бытны...”*.

Зачапіўшы малітву, “адмалкаваму гаварцу па-свойску” няма сілы хоць коратка не абазвацца праз якасьць багаслужбовых перакладаў, што гучаць у дзе-якіх нашых праваслаўных (ды й ня толькі) сьвятынях, і ў гэтага “гаварца”, а можа й больш у каго ствараюць зусім не малітоўны настрой. Пачынаецца бо, напрыклад, сьв. Літургія сьвятаровым выгаласам “*Дабраславёнае валадарства ...*”, першага слова якога няма й ня можа быць у нашай мове.

Справа ў тым, што яно, як быццам, мае быць упадабненьнем да грэцкага *“калос логос”* або лацінскага *“benedictus”* ці ўрэшце царкоўна-славянскага *“благословенно”*, што па-нашаму значыць *“добра+слоўленае”*, а не *“слаўленае”*. І хоць паміж *“словіць”* і *“славіць”* ёсьць падабенства, ці сваяцтва, першае мае значаньне *“мовіць, гаварыць”*, а другое “*хваліць*”.

Калі-ж ад дзеяслова *“хваліць”* вывесьці назоўнік *“хвала”*, а яго абярнуць ў прыметнік *“хвалаваны”*, дык *“Хвалаванае Гаспадарства* (а не *“валадарства”)* будзе адпаведным нашай мове й годным павагі мамэнту пачатным выгаласам адправы.

На гэтым, аднак, моўнае калецтва літургічных перакладаў ня кончыцца, бо перакладнікі, як адзін, ідуць сьледам сьв. Кірылы й Няхведа (Мяхводзя) ды, незважаючы на сынтаксіс (парадак частак мовы ў сказах) у нашай мове, ускрозь гэты парадак будуюць на перайняты з грэцкае мовы царкоўнаславянскі ўзор, дзе чарга словаў у сказах: назоўнік, прыметнік й займеньнік, замест каб ствараць малітоўны настрой, дражніць вуха ягонай супярэчнасьцяй з нашай мовай.

Пагаршаюць гэтую дражню й слоўныя пярэймы з царкоўнаславянскае мовы ды перакладніцкія моўныя вынаходзтвыдзівосы, як *“Ратаўнік”* замест *“Збавец”*. Гэтае апошняе, наводзіць на пытаньне, калі ўсе іншыя народы знайходзяць у іхных мовах словы на назоў Бога, або Збаўца, як *“Pan, Herr, Lord”*, чаму мы ня можам адважыцца скарыстаць на гэта слова *“Гаспадар”*, а ўсяляк перакручваем баўгарызм *“Госпад”* то на мужчынскі род *(“Госпаду памолімся!”)*, то на жаночы *(“Госпадзі, памілуй!)*.

Замяніўшы адно чужое слова сваім, ці ня варта зрабіць тое самае і з шмат іншымі, як напрыклад, з *“Багародзіцай”*, на мейсца якога Рыгор Барадулін здумаў вельмі ўдалы адпаведнік *“Божая Нарадзіца”* ( *гл. “Ксты”*), а тады й на *“Божае Нараджэньне”* казаць *“Божае Нарадзтво”*, ды разам з тым ужо й *“Божую Нарадзіцу”* ня зваць паджылой *“дзевай”*, ці шляхоцкай *“паннай”*, а прыгожым, знойдзеным Ларысай Геніюш, родным словам *“Дзеўна”*.

Але ўсяго гэтага замала, каб абярнуць Божыя Службы ў запраўды беларускія, покуль ня зробленае тое, на што нашыя перакладнікі яшчэ ня здолелі здабыцца, а гэта – покуль пераклады сьпяваных літургічных тэкстаў ня будуць прытарнаваныя ды пакладзеныя на ноты, а хорыкі ў нашых царкоўках перастануць сьпяваць іх, як цяпер, паміж з большага беларускамоўнымі ўпрашаньнямі, па-царкоўнаславянску ці нават па-ангельску, а запяюць іх па-беларуску ды царкоўныя адправы, замест блытаніны ў галавах, стануць запраўды ўздымаць сэрцы да Бога.

Ды ня толькі ў царкве ў нас моўнае няўмецтва, ёсьць яно й ў нашай “палітыцы”, на што адзін з прыкладаў: маўленьне й пісаньне ў родным склоне *“Беларускай Народнай Рэспублікі”*, замест асаблівага нашай мове *“Беларускае Народнае Рэспублікі”*.

Да таго знаходзяцца й “моваведы”, што ў творным склоне, наўзор *“соль” “сольлю”*, усё яшчэ пішуць *“Беларусьсю”*, хоць амаль усе мы не ад цеперся граматычна пішам, кажам і пяем *“Беларусяй”*, прыкладам Н. Арсеньнева: *“Над Беларусяй ціхай і ветлай ...”*

Адхіліўшыся накрыху ў пабожныя справы й палітыку, вярнемся усё-ж да нашае галоўнае тэмы, каб пажаліцца, што й іншыя часткі мовы ў нашым друкаваным слове дазнаюць мноства калецтваў. Возьмем хоць-бы часта сустраканы ўзор выслоўя, як напрыклад,*“ён быў добрым бацькам”*, дзе прыметнік і назоўнік пастаўленыя ў вінавальным склоне, замест патрэбнага ў гэтым выпадку назоўнага: *“ён быў добры бацька”*, *“яна была дбайная маці”*.

Вінавальны склон патрэбен, аднак, калі йдзе праз становішча, якое займала, ці занятак, якім займалася асоба, праз якую гутарка, як *“ён быў валасным старшынём”*, *“яна была настаўніцай”*.

Урэшце, калі гутарка яшчэ праз часткі мовы, трэба сказаць, што іхны парадак у абвестным ладзе *(займеньнік+прыметнік+назоўнік)* можа быць і бывае зьменены ў народных песьнях, паэзыі ды клічным ладзе.

На ўсім тым, што вышэй напісана, нашае моўнае калецтва, нажаль, ня кончыцца – побач зь ім зьбіраецца й іншае сьмецьце. Першы прыклад на гэта неадчэпна ўпадабалы нашымі пісарамі расейска-савецкі канцылярызм *“зьяўляецца”* ў значаньні, што нехта некім, ці нешта нечым ёсьць, як напрыклад, *ён зьяўляецца старшынём*, дзе па-беларуску трэба было-б сказаць *“ён старшыня”*, або замест *(... нешта) зьяўляецца прыярытэтам)*, проста *(... нешта) прыярытэт*.

З падобным бязглузьдзем абыходзяцца ў нас на расейска-савецкі ўзор і йз словам *“выбіраць”*, пішучы *“ён выбіраўся ў дэлегаты”* замест *“ён быў выбраны на дэлегата”*, бо самому можна *“выбірацца”* толькі з хаты, ці памешканьня.

Яшчэ адзін уверад нашай мове – гэта казаньне ці пісаньне слова *“зараз”* у значаньні расейскага *“сейчас”*, хоць яно паказвае на нешта, што будзе неўзабаве або вельмі хутка пасьля ягонага сказаньня, а на тое, што дзеецца тады, калі йдзе гутарка, кажацца *“цяпер”*.

Падобнае робіцца й з словам *“любы”* (з націскам на *“ю”*), што ім (з націскам на *“ы”*) часта карыстаюцца ў значаньні *“абы“*, ці *“хоць які, якая, якое, якія”*.

Ня зводзяцца ў нас і дзеяпрыметнікі мінулага часу, як *“стаяўшы* на ростані крыж”, *“сядзеўшая* на лаве бабка”, *“заснуўшае* ў зыбцы дзіцё”, хоць панаску трэба было-б мовіць *“стаялы* на ростані крыж”, *“сядзелая* на лаве бабка”, *“заснулае* ў зыбцы дзіцё”, або абыйсьці выслоўем *“крыж,* што стаяў на ростані”, *“бабка,* што сядзела на лаве”, *“дзіцё,* што заснула ў зыбцы”, як гэта робіцца й зь дзеяпрыметнікамі цяперняга часу.

Да мноства ўсялякае шкоды далучаецца й зьнявага ў называньні хады грамадою на могілкі, як бывае на Дзяды зь Менску ў Курапаты, *“шэсьцем”*, што ў расейскай мове нагадвае дзею з пераможнае ці трыумфальнае нагоды, а ў сумнай, як у дадзеным выпадку, у нашай ёсьць больш адпаведнае слова *“ісьцеж”*, трэба толькі падумаць і знайсьці.

Дастаецца ад нашых пісараў і самым дзеясловам праз унаду скарыстоўваць іхную хворму аднаразовага трываньня, як *“спрабаваў”*, замест працяглае, г. зн, *“прабаваў”*, або ў чужамоўным значаньні, прыкладам *“зьехаў”*, замест *“выяхаў”*, ці *“паехаў”*.

Знайходзяцца таксама й любцы нашае мовы, што ратуюць яе ад маскоўскае заразы палянізмамі, як *“анёл, апантаны, таньчыць, цуд, цудоўны”* , замест усё-ж наскіх *“ангял, аблытаны* ці *асечаны (гл. слоўнік І. Насовіча, бач. 371), чуд, чудовы,* або *чудоўны*” й інш.

Яшчэ адзін неразумны палянізм – гэта казаньне *“высьвячэньне, высьвяціць”* на прыймо кагось у духоўны стан ці павышэньне ў ім, замест наскага *“усьвячэньне, усьвяціць”*. Тут дарэчы далажыць, што слова *духоўны* па-нашаму значыць сьвятар ці япіскап, а на няцелавае людзкое жыцьцё, г. зн. думаньне ці сьведамасьць трэба казаць *духовае*.

Урэшце, крыху й пра дзе-якія сьвятнія назовы ды прывітаньні зь іхнае нагоды, як *“Мацін Дзень”* і *“Бацькаў Дзень”*, замест нянаскага *“Дзень Маці”* й *“Дзень Бацька”*, а таксама вышэй успомненае *“Хрыстовае Нарадзтво”*, прывітаць зь якім можна словамі *“З Хрыстовым Нарадзтвом і Новым Годам!”*, але лепш

***Заканчэньне на бачыне 7***

Bielarus567c.qxd 4/10/2010 11:39 PM Page 9



# Вітаўт РАМУК

## 15.07.1914 - 09.03.2010



Нарадзіўся ў горадзе Екацярынаслаў, у царскай Расеі (цяпер гэта Днепрапятроўск, Украіна), 15 ліпеня 1914 г. Бацька Ян і маці Ўладыслава з дому Плянко былі суўласьні камі рэстарацыі. Раней у гэты горад пераехалі бацькавыя знаёмыя, параілі пераяжджаць і сям'і Рамукоў. Людзі шукалі лепшых умоваў жыцьця.

У Екацярынаславе нарадзіліся старэйшы брат і малодшая сястра (усяго ў сям'і было пяцёра дзяцей – Вітаўт, Пётра, Фрэд, Станіслава й Ванда). У 1922 г. сям'я вярнулася ў родную Беларусь, у мястэчка Ліпнішкі каля Ліды. Маці займалася выхаваньнем дзяцей, а бацька працаваў на гаспадарцы (бацька памёр у 1941, а маці – у 1942 г.).

У 1926 г. Вітаўт зь Пётрам паехалі ў Вільню й паступілі ў Беларускую гімназію, у якой Вітаўт вучыўся да 1930 г. Вільня тады была цэнтрам беларускага адраджэнцкага руху, але маладыя Рамукі тады былі яшчэ замаладыя, каб у ім удзельнічаць. Вітаўт меў намер стаць сьвятаром і пераехаў у Пінск, дзе закончыў польскую гімназію ў 1937 г. Пазьней раздумаў, бо не пачуваўся адпаведным да духоўнага стану. У 1938 г. паступіў у Віленскі ўнівэрсытэт імя Стэфана Батуры, на факультэт біялёгіі, а пазьней перайшоў на мэдыцыну. Вайна ў 1939 г. і прыход Савецкай арміі змусілі пакінуць вучобу. У 1940 г. працаваў чысьцільшчыкам у амбуляторыі на чыгунцы ў Вільні.

У 1941 г., па прыходзе немцаў, Вітаў Рамук вярнуўся ў Беларусь і працаваў у Лідзе ў цывільнай адміністрацыі перакладчыкам да 1944 г.

Калі наблізіліся савецкія войскі, і немцы пачалі адступленьне, Вітаўт эвакуаваўся й апынуўся ў мястэчку Шонштайн, што на Судэтах (цяпер – тэрыторыя Чэхіі), дзе працаваў на чыгунцы, ладуючы бярвеньне. Пазьней яго скіравалі на фабрыку цукру ў горад Тропаў (цяпер – Апава, Чэхія). У 1945 г., незадоўга да прыходу амэрыканскіх войскаў, пераехаў у горад Эгер (Хеб), адтуль накіраваўся ў Рэгенсбург, дзе зарганізаваўся беларускі ДП-лягер. Пасьля нядоўгага часу паехаў у Мюнхэн, дзе быў адкрыты ўнівэрсытэт UNRRA, і ў 1946 г. паступіў на мэдыцыну. Паколькі не было гарантыяў, што гэты ўнівэрсытэт доўга праіснуе, Вітаўт Рамук перайшоў на нямецкі ўнівэрсытэт. У 1948 г. зарганізаваўся Беларускі Студэнцкі Саюз пад кіраўніцтвам Барыса Рагулі ў Лювэне, на каталіцкім унівэрсытэце была нагода дастаць стыпэндыю. У 1949 г. Вітаўт Рамук паступіў там на факультэт мэдыцыны, які закончыў у 1953 г. Накіраваўся ў Лёндан з надзеяй уладкавацца, але праз год вярнуўся ў Бэльгію. Там знайшоў працу дзіцячага лекара ў брусэльскім шпіталі, у якім працаваў да 1956 г. да выезду ў Амэрыку.

У ЗША сьпярша затрымаўся ў Чыкага, дзе зрабіў гадавы стаж агульнай мэдычнай практыкі, і ў 1957 г. пераехаў у горад Пэорыя, дзе зрабіў яшчэ адзін год агульнай практыкі. На пачатку 1958 г. пачаў працу як лекар у шпіталі, адпрацаваў там чатыры гады. 26 ліпеня 1958 г. ажаніўся зь Верай з дому Жызьнеўскіх. У 1962–1963 г.г. зрабіў год стажу ў пэдыятрыі. У 1963 г. усёй сям'ёй (жонка й двое дзяцей) пераехалі ў Чыкага, дзе Вітаўт Рамук закончыў другі год пэдыятрычнага стажу. У 1964 г. працаваў у шпіталі, злажыў мэдычныя іспыты на права практыкі. У 1965 г. пачаў працаваць у Інстытуце пэдыятрыі ў Чыкага, які займаўся пераважна рэдкімі дзіцячымі хваробамі, дастаў тытул ганаровага асыстэнта прафэсара. Належаў да амэрыканскай пэдыятрычнай арганізацыі. Пазьней перайшоў у іншы дзіцячы шпіталь нэрвова-мэнтальных праблемаў і працаваў там да студзеня 1988 г., калі выйшаў на пэнсію.

Унёсак доктара Рамука ў беларускае грамадзкае жыцьцё ў Чыкага быў вялізны. Ён быў сябрам Беларускага Каардынацыйнага Камітэту ў Чыкага, арганізаваў і ўдзельнічаў у мастацкіх імпрэзах, наведваў з жонкаю Вераю Белы Дом, сустракаўся з прэзыдэнтам Рональдам Рэйганам. Браў удзел у Народных фэстывалях і шматлікіх парадах. Быў добра знаёмы з многімі амэрыканскімі палітыкамі ды іншымі ўплывовымі людзьмі. Др. Рамук валодаў сямі мовамі і лёгка знаёміўся зь людзьмі ўсіх узроўняў грамадзтва. Ад часу заснаваньня і да закрыцьця ён быў прыхаджанінам беларускай уніяцкай царквы Хрыста Збаўца ў Чыкага. Ён рэгулярна дасылаў справаздачы зь беларускага грамадзкага жыцьця ў Чыкага ў газэту "Беларус".

Вітаўт Рамук адыйшоў у лепшы сьвет у доме сваёй дачкі Ірэны Талівэр у горадзе Фрыпарце, штат Ілінойс. Пакінуў у смутку жонку Веру, дачку Ірэну, сына Джона, шматлікіх унукаў і пляменьнікаў, сястру Стасю і брата Фрэда ў Беларусі.

Пахавальная паніхіда была адслужаная ў касьцёле St. Francis Borgia у Чыкага.

*Для некралёгу былі выкарыстаныя ўрыўкі з кнігі Аляксандра Адзінца "Паваенная эміграцыя: скрыжаваньні лёсаў".*

# Анонс

Выйшла ў сьвет кніга Натальлі Гардзіенкі "Беларусы ў Вялікабрытаніі"




*Гардзіенка Натальля.* ***Беларусы ў Вялікабрытаніі.*** *– Менск, 2010. – 620 с. (Бібліятэка Бацькаўшчыны; кн. 18).*

Гэта фундамэнтальная кніга – першая агульная дасьледніцкая праца, прысьвечаная розным аспэктам беларускай прысутнасьці ў гэтай краіне.

Ідэя стварэньня такой кнігі нарадзілася ў 2005 годзе ў сябраў Згуртаваньня Беларусаў у Вялікабрытаніі (старшыня – Лёля Міхалюк), якія і запрасілі дасьледчыцу – на той час аўтарку кнігі "Беларусы ў Аўстраліі" (Менск, 2004) – у Лёндан.

"Беларусы ў Вялікабрытаніі" напісаная на аснове архіваў і фондаў (дакумэнтаў і пэрыядычных выданьняў), што захоўваюцца ў Беларускай бібліятэцы імя Ф. Скарыны ў Лёндане. Выкарыстаныя і ўспаміны грамадзкіх дзеячаў, запісаныя аўтаркай у Лёндане, Манчэстары, Брадфардзе, Бірмінгэме.

Дасьледаваньне закранае гісторыю беларуска-брытанскіх кантактаў, шляхі і матывы прыезду нараджэнцаў беларускіх земляў у Вялікабрытанію. Прычым шырокія кантакты пачаліся яшчэ ў XVIII і працягнуліся ў XIX ст., калі на брытанскія выспы прыехалі паўстанцы 1831 і 1863 гадоў.

Аднак найбольшая ўвага надаецца дзейнасьці паваеннай хвалі беларускай іміграцыі ў гэтай краіне. Падрабязна разглядаецца гісторыя асобных арганізацый беларусаў: Згуртаваньня Беларусаў у Вялікабрытаніі, Хрысьціянскага аб'яднаньня беларускіх работнікаў, Англа-беларускага таварыства, Беларускай бібліятэкі імя Ф. Скарыны ды іншых.

Адмысловая ўвага надаецца рэлігійнаму жыцьцю беларусаў, гісторыі асобных праваслаўных парафіяў у Лёндане, Манчэстары, Бірмінгэме, Брадфардзе ды інш. гарадах, дзейнасьці Беларускай каталіцкай місіі ўсходняга абраду.

Падрабязна апісваюцца таксама беларускія месцы ў Вялікабрытаніі і беларускія могілкі, пададзеныя біяграфіі беларускіх дзеячаў, чыё жыцьцё звязанае з гэтаю краінаю, друкуецца шмат фатаздымкаў.

Сама кніга вялікага фармату, шыкоўна выдадзена, і будзе добрым падарункам усім, хто цікавіцца гісторыяй беларускай эміграцыі і ў прыватнасьці нашымі землякамі на брытанскіх выспах.

***Д. Фл.***

-----------

***Натальля Гардзіенка.*** *Нарадзілася ў Менску. Скончыла Беларускі дзяржаўны ўнівэрсытэт (1999), асьпірантуру БДУ, кандыдат гістарычных навук (2003). Займаецца вывучэньнем гісторыі беларускай эміграцыі, рэдактарка часапісу "Запісы БІНІМ". Займаецца таксама навукова-дасьледчай і пэдагагічнай дзейнасьцю.*

Па пытаньнях набыцьця кнігі зьвяртайцеся ў Згуртаваньне беларусаў сьвету "Бацькаўшчына" па тэлефоне *(+375 17) 200-70-27*, а таксама на мэйл самой аўтаркі *nhardzijenka@gmail.com*.

# Тое што любім – самыя губім

***Заканчэньне з бачыны 6***

больш па-народнаму *"Радай Каляды й Шчадра Налета!"*.

І яшчэ нельга не дадаць, што *"Голас Царквы"* таксама не па-нашаму, па якому было-б *"Царквін Голас"*.

Усё, аб чым была гутарка вышэй, толькі дробная частка нечысьці, што ёю засьмечваецца нашая мова, каб-жа выявіць усю неахайнасьць у карыстаньні ёю ды адвучыць ад такога навыку спатрэбілася-б напісаць ёмістую кнігу, якой, нажаль, нельга спадзявацца.

Няхай-жа мой кароткі прыпамін аб нашым усіхнім моўным няўмецтва ўзварухне суродзічаў зьвярнуць на яго ўвагу ды падштурхне да ўдалых намаганьняў пазбыцца гэтае заганы.

Бог бо абдарыў нас ці не найбагацейшай й найпрыгажэйшай мовай у сьвеце, аднак, каб умець ёю карыстацца, траба гэтак, як і на штодзённы хлеб шчыра й налегліва працаваць .

***Барыс ДАНІЛЮК***

# Сьв. памяці Лявона КАСОЎСКАГА (Касяка)

Пару тыдняў таму назад у Саўт-Рывэры ў царкве сьв. Еўфрасіньні была адпраўленая паніхіда ды адбылася ціхая таварыская бяседа ў памяць Лявона Касоўскага, які адыйшоў год таму ў веку 88 гадоў.

В. пам. Лявон, сямейнае прозьвішча Касяк, паходзіў зь вёскі Гіры на Вялейшчыне, так як і яговыя браты Іван і Кастусь (дарэчы, Івана ў хаце і вёсцы клікалі Янкам). Лявон вучыўся ў Вялейцы й Вільні, аднак навуку перапыніла ваенная завіруха. Сям'я была нацыянальна сьведамая і досыць заможная й таму, калі ў 1939 годзе прыйшлі саветы, даводзілася перакідвацца зь места на места, каб ня быць вывезенай.

У часы нямецкай акупацыі Лявон, як і браты Янка і Кастусь, адразу ўлучыўся ў дзейнасьць беларускай адміністрацыі. Часы былі крутыя: беларусаў нішчылі і палякі, і саветы. Праз некаторы час Лявон становіцца камандантам паліцыі ў горадзе Маладэчна: забясьпечвае, разам з сотнямі іншых, працоўныя ўмовы для беларускага школьніцтва, адміністрацыі. Ці раз даводзілася беларускай паліцыі зброяй ахоўваць беларушчыну ад нападаў і савецкіх, і польскіх партызанаў.

Ад 1944 году Лявон на эміграцыі. Быў у арміі Андэрса, потым асеў у Ангельшчыне, а затым у ЗША, ад канца 1940-х гадоў. Скончыў Лёнданскі ўнівэрсытэт з дыплёмам інжынэра-механіка, а ў ЗША атрымаў дыплём інжынэра на ўнівэрсытэце Дрэксэля ў Філядэльфіі (Master's Degree). У сярэдзіне 1950-х ажаніўся зь Лёляй Лапіцкай (дачкой а. Лапіцкага) і меў двух сыноў Аляксандра і Мікалая ды чатырох унукаў.

У прафэсійнай дзялянцы дысягнуў выдатных посьпехаў: па яговых разьліках паўстала не адна будова гідра- і атамнага энэргапрофілю ў ЗША і вонкі. Быў сябрам розных інжынэрных таварыстваў, а таксама падтрымоўваў беларускія арганізацыі. Быў добрым сем'янінам і пакінуў прыемную, цёплую памяць у сям'і, суродзічаў і супрацоўнікаў – тэхнікаў і інжынэраў кампаніі Trans-America Delaval.

***Супрацоўнікі і сябры***

Bielarus567c.qxd 4/10/2010 11:39 PM Page 2



# Каляндар “БЕЛАРУСА”

**6 красавіка** споўнілася сто гадоў **Барысу Кіту**. Ён нарадзіўся ў 1910 г. у Санкт-Пецярбургу, але ў 1919 г. сям’я вярнулася ў Беларусь. Напачатку было навучаньне ў Наваградзкай, затым –



Віленскай беларускай гімназіі. У 1939 г. ён быў ужо дырэктарам Віленскай гімназіі. За немцамі Кіт працягваў пэдагагічную дзейнасьць. Напачатку вучыў у Лебедзеве Маладэчанскага раёну, затым – у Паставах. Потым заснаваў знакамітую Маладэчанскую гандлёва-адміністрацыйную школу.

Летам 1944 г. сям’я Кітоў пакінула Беларусь. У студзені 1948 г. Барыс Кіт перабраўся ў Саўт-Рывэр, дзе жылі сваякі ягонай жонкі Ніны Корсак. Ён спрычыніўся да абеларушваньня гэтага гарадка, у якім жыло некалькі сот беларусаў – прадстаўнікоў хвалі пачатку XX ст, але цалкам зрусіфікаваных. Кіт, Франук Шаўроўскі і Майк Філіповіч сталі выпісваць у Саўт-Рывэр беларусаў з лягероў для перамешчаных асобаў у Нямеччыне. Вынік стаў бачны ўжо праз год, калі ў Саўт-Рывэры беларусы адсьвяткавалі 25 Сакавіка, а ў гарадку сталі засноўваца беларускія арганізацыі ці іхныя аддзелы. Потым Кіт перабраўся ў Каліфорнію, дзе зьвязаў свой лёс з астранаўтыкай. Гэтую дзейнасьць працягнуў у Вашынгтоне. Ад 1972 г. Барыс Кіт жыве ў Франкфурце-на-Майне.

**15 красавіка 1925 году** ў Лучыцах ля Клецку нарадзіўся **Янка Жучка**. Ад 1944 г. – на эміграцыі. Вучыўся ў Беларускай гімназіі імя Янкі Купалы, здаў іспыты ў Тэхнічную школу ў Карлсруэ, але чакаць навучаньня трэба было год, і Янка Жучка ў складзе “Дванаццаткі” у пачатку 1948 г. выехаў на заробкі ў Англію. На вугальных капальнях працаваў да 1950 г., потым пераехаў разам з калегамі ў Бэльгію ў Лювэнскі ўнівэрсытэт (палітэхнічны факультэт). Янка Жучка зьвязаў сваё жыцьцё з выкарыстаньнем сталёвых канструкцыяў у будаўніцтве, рэдагаваў часапіс “Сталь”. Браў і бярэ актыўны ўдзел у грамадзкім жыцьці беларусаў Бэльгіі, напрыклад, у Саюзе беларусаў гэтай краіны. Зьўляецца радным БНР.

**21 красавіка 2005 году** памёр **Барыс Рагуля**. Вайсковы дзеяч падчас нямецкай акупацыі, правая рука Міколы Абрамчыка ў канцы 1940—1950-х, адзін зь ініцыятараў навучаньня беларускіх студэнтаў у Лювэнскім унівэрсытэце ў Бэльгіі, адзін з актывістаў грамадзкага жыцьця ў Канадзе, намесьнік старшыні Рады БНР – усё гэта добра вядома чытачам. Барыс Рагуля быў таксама выдатным доктарам. У канадзкім Лёндане ён займаўся дасьледаваньнямі па папярэджаньні раку маткі, а таксама раку страўніка, тоўстай і адхадной кішок. У 1973 г. яго абралі кіраўніком гарадзкой мэдыцынскай акадэміі. І на гэтай пасадзе ён прапагандаваў здаровы лад жыцьця, дабіўся, каб на тэрыторыі школаў, шпіталяў было забаронена паленьне.

**29 красавіка 1950 году** беларуская дыяспара ўпершыню ўзяла ўдзел у Парадзе Ляяльнасьці ў Нью-Ёрку. Парад Ляяльнасьці быў задуманы як процівага Першамаю і ставіў за мэту дэманстрацыю ляяльнасьці амэрыканскай дзяржаве. Беларуская калёна, трымаючы ў руках беларускі і амэрыканскія сьцягі, разам з прадстаўнікамі іншых этнічных групаў і амэрыканскімі прайшла па 5-й авэню. Парады перасталі быць актуальнымі пад канец 1970-х.

*АГ*


# КУПАЛЬЛЕ

**Запрашаем разам адзначыць старадаўнюю рамантычную традыцыю КУПАЛЬЛЯ і правесьці незабыўны адпачынак у кампаніі сяродзічаў на ўлоньні прыроды.** Купальскі вечар пачнецца з прызначэньня Князя-Купаліша і Купалінкі, якія распаляць вогнішча. Уночы нячысьцікі выкрадуць Купалінку. Каб даведацца пра іншыя падзеі і абрады купальскай ночы далучайцеся да нас. Частуйцеся крупнікам, у склад якога па традыцыі ўваходзяць 50 лекавых траваў. Можа каму з вас пашанцуе знайсьці сваю папараць-кветку ў гэтую чароўную ноч.

**Калі:** **18-20 чэрвеня 2010 году** (Купальская ноч у суботу 10 чэрвеня).

**Дзе:** Парк ***Ward Pound Ridge Reservation*** у ***Cross River, NY 10518***

**Транспарт:** цягніком са станцыі ***Grand Central*** да прыпынку ***Katonah***. Гэта прыкладна гадзіна язды цягніком ад Мангэтану на ***Metro North, Harlem Line***.

**Кошт:** **$25** дарослым, **$10** дзецям меншым за 12 год. Чэкі выпісвайце на ***Mr. & Mrs. Ryzy*** з адзнакаю “***Купальле***” і дасылайце разам з формаю, надрукаванаю ніжэй, на адрас:
***Piotr & Lena Ryzy***
***P. O. Box 1952***
***Ossining, NY 10562***

**Кантакты:** **Пётра** і **Алена РЫЖЫЯ**, тэл. **(914) 522 - 0742**, эл. пошта: ***LenaBelarus@aol.com***

**Што будзе:** купальскія песьні й танцы на працягу ўсёй ночы, спартовыя спаборніцтвы й гульні, гатаваньне стравяў (прыносьце ежу, грылі там будуць).

**Захапіце з сабою:** - беларускія строі ці адзеньне з сымболікай; дзяўчатам - доўгія спадніцы, хлопцам - доўгія сьветлыя штаны, ня шторты (толькі на час сьвяткаваньня);
- ежу, напоі, спальныя мяшкі, намёты, калі будзеце спаць;
- **$8** (з аўта ў незалежнасьці ад колькасьці пасажыраў) за ўезд у парк (бясплатна пасьля 5-й гадзіны вечара).

Арганізатары забясьпечаць пітную воду і паліва для вогнішчаў і грыляў.

**УВАГА! Колькасьць удзельнікаў абмежаваная (умовамі парку) да 40 чалавек, таму дасылайце рэгістрацыі загадзя.**

**Імя:** ____________________

**Дарослых ($25):** ___, **дзяцей ($10):** ___ **Усяго дасылаю: $** ____

**Ваш тэлефон:** ____________ **E-mail адрас:** ____________

**Паштовы адрас:** ____________________

____________________

**Ці трэба Вас забіраць з прыпынку цягніка?** ___ **Калі?** ______

**Ці даслаць Вам мапу з інструкцыяй, як даехаць да парку?** _____


**Шаноўнае спадарства!** Нагадваем, што 31-га траўня 2010 году заканчваецца тэрмін збору твораў для альманаху беларускіх пісьменьнікаў замежжа **“БЕЛАРУС 2010”**.

Зьмясьціць свае творы ў альманаху маюць права аўтары, якія пішуць па-беларуску ў розных літаратурных накірунках. Адзінае патрабаваньне – аўтары павінны жыць па-за межамі Беларусі.

Плануемы час выхаду альманаху ў сьвет – жнівень 2010 году.

Свае творы аўтарам найлепш дасылаць электроннаю поштаю на адрас: ***hazetabielarus@att.net*** У выключных выпадках, калі аўтары ня маюць доступу да сусьветнага сеціва, творы можна дасылаць поштаю запісанымі на CD ці DVD альбо надрукаванымі на паперы на адрас рэдакцыі:

***BIELARUS / P. O. Box 3225 / Farmingdale, NY 11735 USA***

Тэксты пажадана пісаць тарашкевіцай. Творы напісаныя наркомаўкай, у альманаху будуць надрукаваныя тарашкевіцай.

Кожнаму аўтару, хто вырашыць даслаць свае творы, пажадана таксама даслаць свой партрэтны здымак і кароткую аўтабіяграфію і, калі захочуць, дадатковую інфармацыю пра сябе, якую яны хацелі-б паведаміць сваім чытачам.

З пытаньнямі кантактуйце рэдакцыю. Жадаем посьпехаў!

*Газэта **“БЕЛАРУС”** бясплатна надрукуе кароткія прыватныя паведамленьні й абʼявы некамэрцыйнага характару, віншаваньні, запрашэньні, спачуваньні ды інш.*

***Накont разьмяшчэньня рэклямы кантактуйце рэдакцыю.***

## НА ВЫДАВЕЦКІ ФОНД “БЕЛАРУСА” АХВЯРАВАЛІ:

| | |
|---|---|
| В. Кіпель | 150 |
| М. Ганько | 100 |
| Г. Бахар-Гайда | 100 |
| Л. Рагуля | 100 |
| Н. і С. Дудар | 55 |
| В. Аўдзеева | 50 |
| Н. Баравік | 50 |
| В. Бортнік | 50 |
| А. Вяроўка | 50 |
| А. Дубік | 50 |
| В. Зайка | 50 |
| Н. Кавалеўская | 50 |
| Л. Карпава | 50 |
| А. Кузьміч | 50 |
| В. Паско | 50 |
| А. Паўлючук | 50 |
| Сп-ва Рыжых | 50 |
| М. і Л. Сагановіч | 50 |
| Сп-ва Сокалавых | 50 |
| С. Трыгубовіч | 50 |
| Ж. Чарняўская | 50 |
| Р. Шаратутдзінаў | 50 |
| А. Скрыцкі | 40 |
| І. Сулім | 20 |

**У памяць Я. АЗАРКІ:**

| | |
|---|---|
| М. Азарка | 100 |

**Усім шчыры дзякуй!**


**БЕЛАРУС**

*Газэта Беларусаў у Вольным Сьвеце*

**Выдае штомесячна:**
***Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне***
**Сусьветнае сеціва:** ***baza-belarus.org***

**Падпіска $50 на год.**
**Чэкі выпісвайце на *BIELARUS***

**BIELARUS**

*Belarusan Newspaper in the Free World*

Published monthly by
***Belarusan American Ass’n, Inc.***
Subscription $50 yearly
Make checks payable to ***BIELARUS***

**Рэдагуе калегія.**
**Адказны рэдактар Марат КЛАКОЦКІ**
**Падпіска Сяргей ТРЫГУБОВІЧ**

**Артыкулы, падпісаныя прозьвішчам ці ініцыяламі, могуць зьмяшчаць пагляды, зь якімі Рэдакцыя не згаджаецца.**

**Перадрук дазваляецца толькі пры ўмове зазначэньня крыніцы.**


© BIELARUS, 2010


**Адрас для допісаў і кантактаў:**
***BIELARUS***
***P.O. Box 3225***
***Farmingdale, NY 11735***
E-mail:
***hazetabielarus@att.net***
**Сусьветнае сеціва:**
***www.bielarus.org***


ISSN 1054-9455

**Адказнасьць за зьмест рэклямы нясе рэкламадаўца.**


Вашынгтонскі гурток БАЗА запрашае да супрацоўніцтва беларусаў, а таксама ўсіх, хто жыве ў Акрузе Калюмбія, штатах Вірджынія, Мэрылэнд і Дэлавэр і цікавіцца беларускімі справамі.

Падрабязную інфармацыю пра дзейнасьць гуртка можна атрымаць, напісаўшы на e-mail: ***amnesty_by@gmx.net*** альбо патэлефанаваўшы на нумар (202) 277-5278 (запытаць Вячаслава).